ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ

# ДЗЕДЗІЧ

ДЗЕДЗІЧ
Зберагчы і памятаць

*Для Бацькаўшчыны-маці буду йграць.*
*(Янка КУПАЛА)*

¹ 3 (15)

ÒÐÀÂÅÍÜ 2002

2 ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА! Чарговае супрацьстаянне ў Менску

3 ЯК ВЫ СЯБРА НАЗАВЕЦЕ...

4 ПРАВЕР СВОЙ ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ!

5 ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР: ТРАВЕНЬ – СОНЦАМ САГРЭТЫЯ ДНІ

# ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА!




**19 АПРЕЛЯ В МИНСКЕ СИЛАМИ МИЛИЦИИ БЫЛА РАЗОГНАНА МИРНАЯ АКЦИЯ ПРОТЕСТА «ТАК ЖИТЬ НЕЛЬЗЯ!». БОЛЕЕ СОТНИ УЧАСТНИКОВ ДЕМОНСТРАЦИИ, ПРОХОДИВШЕЙ ПОД НЕПОЛИТИЧЕСКИМИ, СОЦИАЛЬНЫМИ ЛОЗУНГАМИ, БЫЛИ ИЗБИТЫ И АРЕСТОВАНЫ, НЕСКОЛЬКО ЧЕЛОВЕК ПОПАЛИ В БОЛЬНИЦУ.**

Марш Протеста ТАК ЖИТЬ НЕЛЬЗЯ начался, как и было запланировано, в 18 часов на площади Якуба Коласа. Пока подходили люди, организаторы акции говорили в мегафон, перекрикивая милицию, требовавшую разойтись. Речи были про низкий уровень жизни, про ответственность Лукашенко за обнищание белорусов, про ущемление в стране свободы слова и собраний. Однако милиция, подогнав дополнительные мощности, заглушила звуки импрови-

**Працяг на с. 2**

# ЗВАРОТ ДА ЧЫТАЧОЎ

**ШАНОЎНЫ ДРУЖА!**

Ты трымаеш у сваіх руках ужо 15-ы нумар "Дзедзіча". Добры ён, ці дрэнны, вырашаць табе. Але мы ўвесь час імкнемся яго ўдасканаліць, зрабіць больш прывабным для цябе і тваіх сяброў. Мы атрымліваем шмат водгукаў на нашыя публікацыі, пажаданняў па змесце і дызайне нашага выдання, за што складаем вялікую падзяку ўсім, хто нам піша.

Але сёння хацелася б сказаць пра тое, што нас непакоіць. У свой час, у снежні 1999 года, калі мы прынялі рашэнне пачаць выпуск бюлетэня, адной з галоўных мэтаў, якую мы ставілі перад рэдакцыйнай калегіяй, было прыцягненне ў наш клуб новых людзей. Скажам шчыра, што акрамя асобных прыкладаў, такі шлях пашырэння шэрагаў паказаў сваю неэфектыўнасць.

Безумоўна, мы будзем працягваць выпускаць наш бюлетэнь, удасканальваць яго, але вельмі шкада, што наша дзейнасць не прыносіць таго выніку, на які мы спадзяваліся.

Моладзь ва ўсе часы лічылася рухавіком пераменаў, будучыняй нацыі. І мы спрабуем навучыцца працаваць на карысць сваёй Радзімы, каб зрабіць сваё жыццё, жыццё нашых дзяцей трошкі лепшым, чым сёння. І мы заклікаем цябе, дарагі дружа, уключыцца ў нашу супольную справу пабудовы сучаснай, еўрапейскай краіны! Прыходзь да нас, каб мець магчымасць выбіраць сваю будучыню, а не проста плыць па цячэнню! Нам вельмі патрэбна твая дапамога!

Многія пытаюцца: што мне дасць удзел у грамадскай дзейнасці. Мяркуем, што адказ на гэтае пытанне ты можаш знайсці на старонках нашага бюлетэня. А больш падрабязна даведацца пра тое, што ты атрымаеш, калі далучышся да нашай дзейнасці, ты зможаш, калі патэлефануеш па тэл.: 22-90-97, альбо прыйдзеш да нас на вул. Жураўлінуюю, д.20, кв.2 (прыпынак "Зялёная").

**Разам мы пабудуем сваю будучыню!**
**БУДЗЕМ РАЗАМ!**

**Рэдакцыя бюлетэня**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ДЗЕЙНІЧАЕ МОЛАДЗЕВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР

З кастрычніка 2001 г. на базе "Дзедзіча" дзейнічае моладзевы інфармацыйны цэнтр, які аказвае інфармацыйныя, кансультатыўныя, адукацыйныя і тэхнічныя паслугі моладзевым арганізацыям (МА) і ініцыятыўным групам Берасцейшчыны. Там можна атрымаць кансультацыі па рэгістрацыі МА, па вёрстцы газет і бюлетэняў; інфармацыю аб конкурсах праектаў, адукацыйных праграмах, у якіх могуць браць удзел прадстаўнікі МА, кантакты ўсіх МА і ініцыятыўных груп Берасцейскай вобласці. Есць магчымасць карыстацца кампутарам, прынтарам, сканерам, запісваць інфармацыю на CD, працаваць у Інтэрнэце.

У Цэнтры праводзяцца працоўныя сустрэчы па актуальных праблемах дзейнасці МА.

**Dzedzich week-news**

### НАВІНЫ ЖЫЦЦЯ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ – У ЭЛЕКТРОННАЙ РАССЫЛЦЫ

Са студзеня 2002 г. клуб "Дзедзіч" распачаў выпуск электроннай рассылкі Dzedzich week-news з навінамі жыцця моладзевых арганізацый (МА) Берасцейшчыны. Таксама ў рассылцы змяшчаецца інфармацыя аб адукацыйных праграмах, семінарах, аб'явы аб конкурсах праектаў і стыпендыі, безумоўна, крыху гумару. Плануецца, што рассылка будзе штотыднёвай, але чым больш будзе навін, тым часцей яна будзе выходзіць. Пакуль пабачыў свет 5-ы нумар рассылкі. Просім усе МА дасылаць нам інфармацыю пра свае мерапрыемствы – былыя і плануемыя, пра дзейнасць іншых моладзевых ініцыятыў у вашым рэгіёне. Калі вы ведаеце МА ў вашым рэгіёне, якія былі б зацікаўлены ў атрыманні нашай рассылкі і ў асвятленні сваёй працы на яе старонках, просім паведаміць нам іх кантакты.

Падпісацца на рассылку можна, даслаўшы ліст на адрас: dzedzich@mail.ru. І, безумоўна, каб з нашай рассылкі было больш карысці, просім дасылаць нам свае прапановы наконт яе інфармацыйнага зместу, а таксама любыя іншыя заўвагі на той жа адрас.

**Dzedzich week-news**

### КРУГЛЫ СТОЛ ПА ПРАБЛЕМАХ "ХІП-ХОПА"

Моладзевая ініцыятыва "Гном" рыхтуе круглы стол па праблемах "хіп-хопа", што мае адбыцца ў канцы красавіка. Як паведаміла нам кіраўнік "Гнома" Алена Фільчукова, на мерапрыемства плануецца запрасіць маладых людзей, якія займаюцца бомбінгам, прадстаўнікоў гарадскога аддзела народнай адукацыі і кіраўніцтва мясцовых ЖЭКаў і ЖРЭУ.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць па кантактным тэлефоне: (0162) 23-35-67. E-mail: gnom_gazeta@tut.by.

**Dzedzich week-news**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**Рэдакцыя "ДЗЕДЗІЧА" з задавальненнем прыме ад Вас бясплатныя прыватныя аб'явы ў наступны нумар бюлетэня, які пабачыць свет у сярэдзіне чэрвеня 2002г.**

**Звяртайцеся па тэл.: (0162) 22-90-97 да 20.05.02.**



# ТАК ЖЫЦЬ НЕЛЬГА

зированного митинга уже через двадцать минут после его начала.

Тогда организаторы акции обратились к пришедшим людям с предложением проследовать на отведенную для акции площадь Бангалор. Участники Марша единогласно проголосовали за это решение и колонна из тысячи человек начала движение. Люди, однако, далеко не ушли – уже на пересечении проспекта Скорины и улицы Козлова дорогу им перегородили ряды милиционеров в зеленом и голубом камуфляже. Возле кордона, подчеркивая ненасильственный, мирный характер акции, колонна развернулась в обратном направлении.



**Задержания участников акции**

Однако решение о разгоне акции под лозунгами «Требуем возвращения вкладов!», «Требуем повышения стипендий, зарплат и пенсий!» и других уже, видимо, было принято. Из подъехавших автобусов выскочили спецназовцы и напали на демонстрантов. На подавление акции были брошены огромные силы. На одного демонстранта приходилось по несколько молодчиков в форме. И тогда люди сели на асфальт, выставив навстречу дубинками голые руки. Милиционеры бросали в автобусы всех подряд. Людей били ногами и дубинками, волочили по земле. Валерия Щукина избили так, что он потерял сознание и долго лежал на газоне до приезда «скорой».



**Избитый милицией журналист Валерий Щукин**

Более ста человек было арестовано и избито МИЛИЦИЕЙ во время проведения неполитической, социальной акции «Так жить нельзя!». В числе арестованных всемирно известный режиссер Юрий Хащеватский, журналист Валерий Щукин, правозащитник Дмитрий Бондаренко, художник Николай Халезин. Как передает сотрудник пресс-центра хартии Наталья Радина, избиение арестованных участников акции продолжалось и после доставки их в РОВД. Два человека увезены на скорой с переломами ребер и сотрясением мозга.

**Вот как прокомментировал события 19 апреля А.Г. Лукашенко в своём очередном послании к парламенту. Как говорится, без комментариев…**

«…я вернусь к последним событиям. Три с половиной сотни «отмороженных» людей.

Многие спрашивают: «А что же произошло? Как это оценивает Президент? Что случилось?» Скажу просто: люди, которые это спровоцировали, что хотели, то и получили… Шли по тротуарам, по проезжей части… Видят, картинка не получается. Легли на проезжую часть.

Скажите, что должен был делать министр внутренних дел? Он же знает, что Президент контролирует, наблюдает за его действиями, да и люди, минчане, тоже. Что должен делать работник милиции, который обязан обеспечить безопасность граждан? Чего ты, господин Щукин, лег на проезжую часть, это же не ложе для сна! Легли и лежат.

Ну, начали спокойно переносить. Начали драться. Ну, там же тоже мужики. Получили...»

**Уладзімір ТАРНОЎСКІ**

**Фота: IREX/ProMedia**

# СКАЖЫ МНЕ, ЯКІ ТВОЙ НОМ, І Я СКАЖУ, ХТО ТЫ

ЯК ВЫ СЯБРА СВАЙГО НАЗАВЕЦЕ, ТАКІ, ЗНАЧЫЦЦА Ў ЯГО І НОМ. ВЫ НЕ ВЕДАЕЦЕ, ШТО ГЭТА ТАКОЕ, СКАЖАЦЕ, ШТО НЯМА Ў ВАШАГА СЯБРА НІЯКАГА НОМА? ЁСЦЬ-ЁСЦЬ, ПРЫЧЫМ І Ў ВАС ТАКСАМА.

Кажучы па-просту, ном – гэта мянушка. Калі ж па-разумнаму, ном – гэта назва (ад лацінскага nomino – "называць, даваць імя"). Жыццёвым вопытам даказана, што гэта рэч неабходная. Імёны, што даюць нам пры нараджэнні бацькі, часта нясуць у сабе скрыты сэнс. Большасць з іх грэчаскія альбо лацінскія, і не ўсе ведаюць іх значэнне, літаральны пераклад. Прытым, колькасць імёнаў, як ні круці, абмежаваная, што прыводзіць да іх частага паўтарэння. А номы арыгінальныя, часта непаўторныя і выдзяляюць чалавека з натоўпу. Разглядзім жа гэтую з'яву больш уважліва.

Па некаторых назіраннях, выдзяляюцца чатыры асноўныя віды номаў: ном, утвораны ад прозвішча або імені, ном, нададзены паводле нейкай прыкметы, ном-факт і самаробкі.

Номы Моня (Манастырская), Гарык (Ігар), Карась (Красько), Левы (Леванові̇ч), Зорка (Зарэцкая) утвораныя ад імёнаў і прозвішчаў. Каб выдумаць такі ном, асаблівага розуму не трэба. Таму ён бадай што самы распаўсюджаны. Практычна кожны з нас меў шчасце насіць такі. Што ж, калі Вы Баранаў, Казлоў ці Лосеў, застаецца толькі паспачуваць Вам.

Другі від нома даецца чалавеку дзякуючы якой-небудзь характэрнай яго рысе або ўласцівасці. Гэтая група ўключае такія хіты, як Тоўсты, Лысы, Доўгі, Рыжы, прычым гэтыя номы могуць выкарыстоўвацца не толькі ў прамым, але і ў пераносным, супрацьлеглым значэнні. Дарэчы, такія номы даюцца не толькі па знешніх прыкметах: нешта накшталт Пня можна атрымаць за тупасць, Дзікага – за нязносны характар, а номы Бос, Шэф, Бацька дастаюцца людзям уладным ці тым, якім дазваляе гэта становішча.

Номы-факты ў прыродзе сустракаюцца не так часта, як апісаныя вышэй віды, затое яны найбольш цікавыя, таму што ў іх аснове ляжыць які-небудзь факт рэчаіснасці альбо выпадак з жыцця. Чэкістамі называюць хлопцаў, якія ўмомант тлумачаць зашыфраваныя запіскі, што курсуюць паміж партамі ў школе. Адзін мой знаёмы хлопец меў мянушку Зорны, а ўсё пачалося з таго, што ў школе новая настаўніца, пабачыўшы яго, апранутага ў гальштук і гарнітур, усклікнула: "Які зорны хлопчык!". А вось за звычку заўсёды і ўсюды расказваць показкі пра паручыка Ржэўскага адзін з сяброў нашага клуба (не будзем называць яго імя) атрымаў мянушку Паручык.

Самаробкі – гэта номы, якія людзі даюць сабе самі: нікі і псеўданімы. Псеўданім – несапраўднае імя, якое часам бяруць сабе пісьменнікі (Танк, Вольны, Колас, Купала), артысты. Бяруць іх з рознымі мэтамі, напрыклад, сціпласць уладальніка не дазваляе падпісвацца ўласным імем. А часам журналіст баіцца помсты персаналій, закранутых у сваіх артыкулах (гэта акурат пра мяне). Але асноўная прычына – жаданне замяніць сваё сапраўднае імя на больш мілагучнае альбо запамінальнае, што вельмі важна для пачынаючых ва ўмовах жорсткай канкурэнцыі. Бо не ўсе ж нараджаюцца ДэЦламі, Данка або Земфірамі. А калі ты – проста Марыя? Вось і Анжэліка (?) Варум так думае (хаця Маша Варум, на мой погляд, таксама гучыць). У рэшце рэшт назвалі бацькі дачку Сарай, а яна вырасла, стала спявачкай, і ёй хочацца, каб яе называлі Кветачкай. Што ў гэтым дрэннага?

Прызначэнне ніка – хаваць імя і асобу свайго ўладальніка ў сетцы Internet. У адрозненне ад псеўданімаў, нікі не заўсёды ззяюць прыгажосцю і гучнасцю, затое па большасці з іх немагчыма вызначыць пол і нават нацыянальнасць чалавека, таму што ў асноўным яны ўсе пішуцца лацініцай: Voodoo, Xvost, Cmok, Lycky, Dynamic.

P.S. Усе номы рэальныя, да не пакрыўдзяцца на мяне іх уладальнікі.

**Алена МА¨ВАЯ**

# ЭКЗАМЕНЫ – ГЭТА ЗУСІМ НЕ СТРАШНА!

У складаны перадэкзаменацыйны перыяд многія бацькі паводзяць сябе не заўсёды правільна. Іншы раз ледзь не садзяць дзіця пад арышт. Рабіць так нельга. Не трэба перашкаджаць яму сустракацца з сябрамі, займацца спортам, наведваць дыскатэкі і тэатры. Усё гэта неабходна для расслаблення і разрадкі. Адзінае патрабаванне – дакладнае выкананне рэжыму дня, асабліва ў адносінах да сну. Вучоныя лічаць, што лягчэй за ўсё інфармацыя засвойваецца з 7 да 12 і з 14 да 17-18 гадзін. Выключэнне складаюць толькі закаранелыя "совы" – яны дасягаюць найбольшых поспехаў позна ўвечары або ўначы.

Зусім не апошнюю ролю ў працэсе запамінання і засваення прачытанага адыгрывае правільнае харчаванне. Стымуляваць работу мозга дапамагае ежа, багатая на бялкі (мяса, рыба, яйкі) і добра засваяльная (гародніна). Пазбягайце тлустага, мучнога, салодкага. Есці трэба часта, але пакрысе. Абавязкова ўключыце ў меню мёд, арэхі, садавіну. Не дазваляйце злоўжываць кавай, яна выклікае трывожны стан, асабліва ў няўпэўненых у сабе дзяцей.

Першае, з чаго неабходна пачаць,- шчыра самому сабе прызнацца, што ведаеш і чаго не ведаеш, ці здолееш сам засвоіць матэрыял або табе неабходна дапамога. Улічы, што ўпэўнены выгляд дзейнічае заўсёды станоўча і ў многім вызначае экзаменацыйную адзнаку.

І яшчэ: як бы ні складваліся твае адносіны з настаўнікам на працягу ўсяго навучальнага працэсу, "завальваць" ён цябе не будзе. Так што не нервуйся, а лепш засяродзь сваю ўвагу на падрыхтоўцы.

**Кацярына ДРАЗДОВА**

## АДНЫМ РАДКОМ

### ЯК І ДЗЕ МОЖНА АДПАЧЫЦЬ – ВЕДАЮЦЬ У КОБРЫНЕ

Вандроўку на Украіну ажыццявіла моладзь Кобрына ў складзе 12-ці чалавек. За свой кошт кобрынцы 26-31 сакавіка наведалі пячору "Млынкі", што ў Цярнопальскім краі. Арганізатарам вандроўкі выступіў адзін з лідэраў кобрынскай МА "Абра" Андрэй Чырун. Да ўдзелу ў вандроўцы былі прыцягнуты таксама школьнікі. Файна, што нашыя сябры з Кобрына сярод працы ўсё ж такі знаходзяць час для адпачынку!

**Dzedzich week-news**

### "ПРЭС-БУМЕРАНГ" ПАЗБАВІЛІ ПАМЯШКАННЯ

Прайшоў амаль месяц з таго часу, як у Кобрыне зачыніўся моладзевы цэнтр "Гармонія". На жаль, у нашых калегаў не хапае сродкаў, каб аплаціць выдаткі на "пражыванне" ў дзяржаўным памяшканні. Да таго ж і памяшканне гэтае ўжо даўно патрабуе капрамонту. Гарадскія ўлады ўжо ў каторы раз абяцаюць аказаць дапамогу, але ж ці дачакаешся яе? Тым не менш, дзейнасць МЦ "Гармонія" не перапыняецца. На даму працягваецца выпуск газеты "Прэс-бумеранг". Што ж, пажадаем нашым калегам аптымізму!

**Dzedzich week-news**

### НЕ ПРАСАДЗІ ЗДАРОЎЕ

У сераду, 1 траўня, у 14[00], падчас выступу берасцейскага рок-гурта "САД" у гарадскім парку імя 1 траўня па ініцыятыве клуба "Дзедзіч" мае адбыцца акцыя "Не праСАДзі здароўе!". Падчас канцэрта сябры клуба будуць раздаваць інфармацыйныя буклеты пра СНІД і сцяжкі з эмблемай "STOP СНІД!".

Гэта не адзінае мерапрыемства дзедзічаў па барацьбе са СНІДам. Сябры клуба ўжо правялі каля 50-ці адукацыйных семінараў на тэму ВІЧ/СНІД для вучняў сярэдніх школ і студэнтаў ПТВ.

**Dzedzich week-news**

### АДЗНАЧЫМ ГАДАВІНУ ПАЧАТКУ ПАЎСТАННЯ Т.КАСЦЮШКІ

Сябры берасцейскай філіі МГА "Гісторыка" ладзяць 27 красавіка вандроўку ў в. Сяхновічы (Жабінкоўскі р-н), дзе ўсталяваны адзіны на Беларусі помнік Тадэвушу Касцюшку. Вандроўка прымеркавана да чарговай гадавіны з дня пачатку паўстання пад яго кіраўніцтвам. Запрашаюцца ўсе жадаючыя.

Кантактны тэлефон для дадатковай інфармацыі: (0162) 42-67-47 (Наста Ільіна).

**Dzedzich week-news**

### ІМІДЖ – УСЁ!

Круглы стол моладзевых арганізацый Беларусі «Моладзевыя арганізацыі сёння і заўтра: магчымасці ўплыву на грамадства» прайшоў у Менску 20 красавіка. На паседжанні круглага стала былі абмеркаваны праблемы дачыненняў моладзевых арганізацый з грамадствам, фарміравання пазітыўнага іміджу трэцяга сектара і шляхі іх вырашэння.

Удзельнікі круглага стала прыйшлі да высновы, што адным з самых дзейсных на сёння варыянтаў уплыву на грамадскую свядомасць могуць стаць акцыі, накіраваныя на вырашэнне канкрэтных сацыяльных праблем рэгіёнаў.

**Dzedzich week-news**

СПАЗНАЙ СЯБЕ

# ЯКІ ТВОЙ ТВОРЧЫ ПАТЭНЦЫЯЛ?

У СВАІХ ПАЖАДАННЯХ НЕКАТОРЫЯ НАШЫ ЧЫТАЧЫ ВЫКАЗАЛІСЯ ЗА ТОЕ, КАБ НА СТАРОНКАХ «ДЗЕДЗІЧА» ЧАСАМ ДРУКАВАЛІСЯ ТЭСТЫ. СЛОВА ЧЫТАЧА ДЛЯ НАС – ЗАКОН!

Тэст дазваляе ацаніць узровень вашага творчага патэнцыялу, здольнасць прымаць нестандартныя рашэнні. Ад вас патрабуецца выбраць адзін з варыянтаў адказаў.

**1. Ці лічыце Вы, што навакольны свет можа быць палепшаны?**
а) Так.
б) Не, ён і так дастаткова добры.
в) Так, але толькі асобныя моманты.

**2. Ці лічыце Вы, што самі можаце прымаць удзел у значных зменах навакольнага свету?**
а) Так.
б) Не.
в) Так, у некаторых выпадках.

**3.Ці лічыце Вы, што некаторыя з Вашых ідэяў прынеслі б значны прагрэс у той сферы дзейнасці, у якой Вы працуеце?**
а) Так.
б) Так, у спрыяльных абставінах.
в) Толькі ў некаторай ступені.

**4. Ці лічыце Вы, што ў будучым будзеце граць у грамадстве такую важную ролю, што зможаце нешта прынцыпова змяніць?**
а) Так, хутчэй за ўсё.
б) Гэта малаверагодна.
в) Магчыма.

**5.Калі Вы вырашаеце здзейсніць нешта, ці думаеце Вы, што сапраўды ажыццявіце сваё пачынанне?**
а) Спадзяюся.
б) Часам сумняваюся.
в) Упэўнены.

**6. Ці адчуваеце Вы жаданне заняцца справай, якую абсалютна не ведаеце?**
а) Так, невядомае мяне заўсёды прыцягвае.
б) Невядомае мяне не цікавіць.
в) Усё залежыць ад характару гэтай справы.

**7. Калі Вам прыходзіцца займацца незнаёмай справай, ці адчуваеце Вы жаданне дабіцца ў ёй дасканаласці?**
а) Так.
б) Буду задаволены тым, чаго паспеў дабіцца.
в) Так, пры ўмове, што гэта падабаецца.

**8. Калі справа, якую Вы не ведаеце, Вам падабаецца, ці не ўзнікае жадання ведаць пра яе ўсё?**
а) Так.
б) Не, я б хацеў навучыцца толькі самаму асноўнаму.
в) Не, хачу задаволіць толькі сваю цікавасць.

**9. Калі Вам нешта не ўдаецца, што Вы робіце?**
а) Будзеце працягваць упарціцца, насуперак усялякаму сэнсу.
б) Адмаўляецеся ад далейшай дзейнасці, разумеючы, што яна нерэальная.
в) Працягваеце рабіць сваю справу, нават калі стане відавочна, што перашкоды неадольныя.

**10. Прафесію трэба выбіраць, зыходзячы з:**
а) Сваіх магчымасцяў, далейшых перспектываў для сябе.
б) Стабільнасці, значнасці, патрэбнасці прафесіі для грамадства.
в) Пераваг, якія яна забяспечыць.

**11. Вандруючы, Вы маглі б лёгка арыентавацца па маршруце, які ўжо прайшлі?**
а) Так.
б) Не, баюся згубіцца.
в) Так, але толькі там, дзе мясцовасць спадабалася і запомнілася.

**12. Адразу ж пасля размовы Вы зможаце ўспомніць усё, аб чым у ёй гаварылася?**
а) Так, без цяжкасцяў.
б) Усё ўспомніць не змагу.
в) Запомню толькі тое, што мяне цікавіць.

**13. Калі Вы чуеце слова на незнаёмай мове, ці зможаце паўтарыць яго па складах, без памылак, нават не ведаючы яго значэння?**
а) Так.
б) Так, калі гэтае слова лёгка запамінаецца.
в) Паўтару, але не зусім правільна.

**14. У вольны час Вы:**
а) Застаецеся сам-насам – паразважаць.
б) Знаходзіцеся ў кампаніі.
в) Мне ўсё роўна.

**15. Вы займаецеся нейкай справай. Вырашаеце перапыніць гэты занятак толькі калі:**
а) Справа скончана і здаецца Вам выдатна зробленай.
б) Вы больш-менш задаволеныя.
в) Вы яшчэ не ўсё зрабілі.

**16. Калі Вы адзін:**
а) Любіце марыць пра якія-небудзь, няхай нават абстрактныя, рэчы.
б) Стараецеся знайсці занятак.
в) Часам любіце памарыць, але пра рэчы, не звязаныя з працай.

**17. Калі нейкая ідэя захоплівае Вас, то будзеце думаць пра яе:**
а) Незалежна ад таго, дзе і з кім знаходзіцеся.
б) Можаце рабіць гэта толькі калі адзін.
в) Толькі там, дзе не вельмі шумна.

**18. Калі Вы адстойваеце нейкую ідэю:**
а) Можаце адмовіцца ад яе, калі выслухаеце пераканаўчыя аргументы апанента.
б) Застанецеся пры сваёй думцы, якія б аргументы не выслухалі.
в) Зменіце сваю думку, калі супрацьстаянне будзе вельмі моцным.

**КЛЮЧ**
Падлічыце балы, якія Вы набралі, такім чынам:
за адказ "а" – 3 балы;
за адказ "б" – 1 бал;
за адказ "в" – 2 балы.

**ВЫНІК**
**Менш за 24 балы.** Ваш творчы патэнцыял, на жаль, невялікі. Але, можа, Вы проста недаацанілі сябе, свае здольнасці? Адсутнасць веры ў свае сілы можа прывесці Вас да думкі, што Вы ўвогуле не здольныя да творчасці. Пазбаўцеся гэтага і такім шляхам вырашыце праблему.

**24 – 48 балаў.** У Вас нармальны творчы патэнцыял. Вы валодаеце тымі якасцямі, якія дазваляюць тварыць, але ў Вас ёсць праблемы, што тармазяць працэс творчасці. Ва ўсялякім выпадку, Ваш творчы патэнцыял дазволіць Вам творча праявіць сябе, калі Вы, канешне, гэтага пажадаеце.

**Больш за 48 балаў.** У Вас закладзены значны творчы патэнцыял, які дае Вам багаты выбар творчых магчымасцяў. Калі Вы на справе зможаце прымяніць свае магчымасці, то перад Вамі адкрыты самыя разнастайныя формы творчасці.

**Падрыхтавала Алена МА¨ВАЯ**

# СВЯТЫ І БУДНІ: ШТО ЕСЦІ?

Абрадавая ежа – арганічная частка каляндарных свят і абрадаў; гістарычна выконвала важную ролю ў народнай педагогіцы, захаванні і перадачы з пакалення ў пакаленне духоўных традыцый нашых продкаў. Ідэйны змест свята, яго сімволіка вызначалі ўжыванне той ці іншай абрадавай ежы, спосабы яе прыгатавання, падачы на стол. Найбольш распаўсюджанай абрадавай ежай у беларусаў былі каша (куцця), хлеб, каравай, печыва, бліны, сыр, яйкі, яешня, мяса, мёд, канун, саладуха, віно і інш.

Частку абрадавай ежы, ваду і некаторыя напіткі асвячалі ў храме (свянцоная ежа). Куццю гатавалі на Каляды тройчы – да Ражства, Новага года, Вадохрышча. Кожнаму каляднаму святу адпавядаў характар ежы: вячэру перад Ражством і Вадохрышчам складалі посныя стравы, пры сустрэчы Новага года (Васілле) ладзілі так званую скаромную, ці шчодрую куццю, калі на святочны стол падавалі кашу з салам ці маслам, парсючка, паляндвіцу, каўбасы, рознае печыва. На **Масленіцу** (Сырны тыдзень), што адзначала пачатак адраджэння прыроды, пяклі бліны і аладкі. Масленіца заканчвалася нядзельнымі запускамі (ці запустамі), калі на вячэру падавалі малочныя стравы – сыр, масла, смятаннікі, тварог з малаком і інш. На **Саракі**, што прыходзіліся на дзень вясновага раўнадзенства, чакалі прыходу цяпла і прылёту з выраю птушак, з гэтай нагоды выпякалі пячэнне ў форме птушак. У Заходняй Беларусі выпякалі абрадавае печыва на **Благавешчанне**, што сімвалічна супадала з прыходам вясны і прылётам буслоў. Пячэнне і каржы (галёпы, падпалкі) тут рабілі ў форме бусліных лапак, пералётных птушак, земляробчых прылад працы – сахі, бараны, сярпа.

Хлеб-соль, абрадавыя каржы, яйкі, мяса бралі з сабой у час наведвання вясновай нівы (провідкі) і пры адкрыцці палявых работ (заворванне, засеўкі), шкарлупінне ад яек, косці ад мяса закопвалі на мяжы пасля трапезы.

Пастухі ў першы раз выганялі статак на **"Юр'еўскую расу"**. У гэты дзень яны атрымлівалі ад вяскоўцаў шчодрыя пачастункі – яйкі, хлеб, сала, медавуху, гарэлку; у другой палове дня яны раскладвалі вогнішча ў полі і гатавалі на патэльні або ў гаршку рытуальную яешню, з якой тройчы абыходзілі статак, прамаўлялі магічныя замовы і заклінанні, каб зберагчы жывёлу ад хваробы і драпежнікаў.

Яешню, бліны і рознае печыва бралі з сабой, адпраўляючыся ў лес на **Сёмуху** (Троіцу); дзяўчаты ладзілі тут рытуальную трапезу пад звязанымі верхавінамі маладых бярозак, якія ўпрыгожвалі каляровымі стужкамі. Яешня была абавязковай абрадавай стравай і на **Купалле**. Да купальскага свята варылі саладуху і кулагу; апошнія шырока ўжываліся ў перыяд Пятроўскага і Спасаўскага пастоў. Асновай абрадавай ежы на **Пятроўку** (12 ліпеня) былі сыр і малочныя прадукты. На **Спас** (19 жніўня) асвячалі ў царкве хлеб новага ўраджаю, яблыкі, грушы, мёд, пяклі пірагі з макам, яблыкамі, мёдам. На **зажынкі** прыносілі з сабой у поле хлеб і сыр, якія цырымонна клалі на першую зжатую жменю жыта, пакрываючы яе ручніком. Хлеб і сыр (разам з пучком першых зжатых каласоў) прыносілі дадому і ладзілі святочны стол.

Рытуальнай трапезай адзначалі і першы нажаты і пастаўлены ў бабку дзесятак снапоў, рэшткі ежы ад трапезы закапвалі каля ўзмежку, на месцы першага зажыннага снапа. На дажынкі выпякалі каравай, бліны, гатавалі густую кашу, мядовую сыту, мясныя стравы. Густая каша, паводле павер'я, павінна была садзейнічаць густым усходам, даючы добры пачын будучаму ўраджаю.

**Кацярына ДРАЗДОВА**

# «ЗБЕРАЖЫ МІНУЎШЧЫНУ! КАБ МЕЦЬ БУДУЧЫНЮ!»

ПАД ТАКОЙ НАЗВАЙ «ДЗЕДЗІЧ» ПРАВЁЎ СВАЮ ЧАРГОВУЮ АКЦЫЮ

**ЗАНЯДБАНАЯ СПАДЧЫНА**

У нядзелю, 14 красавіка, сябры клуба “Дзедзіч” і берасцейскай філіі МГА “Гісторыка”, студэнты БрДУ і вучні СШ №15 правялі ачыстку руін кляштара бернардзінак, што знаходзіцца на Шпітальным востраве Брэсцкай крэпасці. Акцыя была прымеркавана да Сусветнага Дня помнікаў і мясцінаў, які штогод адзначаецца 18 красавіка па ініцыятыве ЮНЭСКА.

Улетку 2000 года на тэрыторыі крэпасці дзедзічы ўжо арганізоўвалі летнік па ўпарадкаванні кляштара. Былі высечаныя дрэвы наверсе, а таксама ачышчаныя пакоі ад цэглы і рознага смецця. На гэты раз уборка насіла прафілактычны характар, і мела на мэце прыцягненне ўвагі грамадскасці і ўладаў да праблемы захавання адзінага будынка, што застаўся з часоў Сярэднявечча ў нашым горадзе. Былі прыбраныя ўнутраныя памяшканні кляштара, а таксама акаляючая яго тэрыторыя. Пасля заканчэння акцыі кіраўніца берасцейскай філіі МГА “Гісторыка”, студэнтка 3 курса гістфака БрДУ Наста Ільіна правяла для ўдзельнікаў мерапрыемства экскурсію па старажытным Берасці.

Кляштар бернардзінак – найстаражытнейшая пабудова Берасця – на сённяшні дзень знаходзіцца ў вельмі дрэнным стане і патрабуе неадкладнай кансервацыі.

Кляштар, пабудаваны ў 1624 годзе, з‘яўляецца адзіным з помнікаў старога Берасця, які захаваўся да нашага часу. Сам ён уваходзіў у архітэктурны комплекс, што складаўся з касцёла бернардзінак і ўласна кляштара.

У Берасці бернардзінцы з’явіліся ў першай чвэрці XVII ст. па запрашэнні біскупа луцка-берасцейскага Марціна Шышкоўскага. ¨н аддаў ордэну свой дом і ўчастак на Валынскім прадмесці горада, а таксама пабудаваў для манахаў капліцу.

Першапачаткова, у 1605 г., бернардзінцамі былі ўзведзеныя драўляныя пабудовы мужчынскага кляштара і касцёла. У 1623 г. на ахвяраванні Льва Сапегі і Яна Галемскага на месцы драўлянага з’явіўся каменны касцёл, асвечаны імем Яна Хрысціцеля і Святой Ганны. І толькі праз год у непасрэднай блізіне (літаральна цераз дарогу) былі узведзеныя будынкі жаночага кляштара і касцёла.



Пасля працы. Усе разам

Касцёл Яна Хрысціцеля быў тыповым для Беларусі трохнефавым храмам у стылі барока з багатым унутраным убранствам. Шматлікія ахвяраванні зрабілі яго цэнтрам духоўнага і грамадскага жыцця Берасця. Тут праходзілі земскія соймы і святочныя службы, якія збіралі шмат прыхаджан.

Мужчынскі і жаночы касцёлы ўяўлялі сабою адзіны на Беларусі таго часу бернардзінскі комплекс, які ствараў завершаны ансамбль плошчы. Кожная келля мела выхад у галерэю з відам на ўнутраны дворык.

У 1656 г. па загаду гетмана ВКЛ Паўла Сапегі



Падчас працы. Ачыстка ўнутраных памяшканняў

будынкі бернардзінцаў з прычыны наступу шведаў і небяспекі аблогі былі разабраныя для ўмацавання абарончага валу. Пазней гетман выдзеліў з казны грошы на рэканструкцыю. Ян Казімір, кароль РП, даў бернардзінцам штогадовы прывілей на 500 злотых ад берасцейскіх мяшчан, што таксама дапамагло аднавіць храмы.

Сваіх фундатараў бернардзінцы шанавалі і хавалі іх у сутарэннях касцёла, а на сценах змяшчалі шыльдачкі з імёнамі памерлых. Сярод іншых тут атрымалі апошні прытулак суфраган беларускі Пётра Пацей, Ян Галемскі, Павал Сапега, пісар земскі, італьянец Бернард Арагон.

Пасля будаўніцтва Брэст-Літоўскай крэпасці будынкі бернардзінцаў былі пераабсталяваныя пад кадэцкі корпус, які насіў імя цэсарэвіча Аляксандра і дзейнічаў у перыяд з 1842 па 1854 гг. Многія з выпускнікоў корпуса сталі генераламі Расейскай імперыі, а Яраслаў Дамброўскі – генералам Парыжскай камуны.

Пасля пераводу корпусу ў Маскву пабудовы сталі выкарыстоўваць пад медыцынскія ўстановы. У 1918 годзе касцёл пры мужчынскім кляштары быў узарваны немцамі.

Сёння ад усяго некалі велічнага і багатага комплексу пабудоваў часткова захаваўся жаночы кляштар, ад мужчынскага – толькі падземныя тунэлі і фундаменты асобных частак. Напачатку 1990-х тут праводзіліся археалагічныя раскопкі, падчас якіх былі знойдзеныя шматлікія, часта ўнікальныя, рэчы.

**Сяржук ПРЫЛУЦКІ**

**ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР**

# ТРАВЕНЬ – СОНЦАМ САГРЭТЫЯ ДНІ

## 1 ТРАЎНЯ

1 траўня 1945 г., калі савецкія войскі ўваходзілі ў Берлін, нацысцкі шэф прапаганды **¨зэф Гебельс** зрабіў самагубства — разам з жонкай і шасцю дзецьмі. Па-зверску кіраваў, па-зверску і развітаўся з жыццём.

Сёння ў 305 г. рымскі імператар **Дыаклетыян** добраахвотна адмовіўся ад улады. Вось жа бываюць людзі!

## 2 ТРАЎНЯ

Сёння ў 1729 г. нарадзілася расейская імператрыца **Кацярына ІІ.** Менавіта ёй Беларусь абавязаная сваім двухсотгадовым паднявольным становішчам. Падчас панавання Кацярыны народы Вялікага Княства Літоўскага патрапілі пад расейскую каланізацыю. Тры магутныя паўстанні за незалежнасць не прывялі да жаданага выніку, і ў Вільні, сталіцы краю, урэшце быў устаноўлены помнік Кацярыне ІІ. Праз сто гадоў пасля смерці імператрыцы ідэя гэтага помніка ўзнікла ў віленчука Антакольскага. Помнік стаў на Катэдральным пляцы, прыблізна там, дзе цяпер знаходзіцца конная статуя Гедыміна. Праўда, да ўстаноўкі помніка бум Кацярыны крыху апаў, – лілі не з бронзы, а з чыгуну, а сам скульптар ужо два гады як не жыў. У пачатку нашага стагоддзя пры помніку ўвесь час стаяла варта, а сам ён не прастаяў і дзесяці гадоў. У часе першай Сусветнай вайны чыгун спатрэбіўся на іншыя мэты. Адзін з герояў Максіма Гарэцкага згадваў: “А як прыгожа стаяла на Катэдральным пляцы пышная чыгунная Кацярына Вялікая, горда выставіўшы высокія грудзі!“ Вось і ўсё, што засталося ў памяці беларусаў ад Кацярыны. А яшчэ — памкненне кіраўнікоў краіны да аб`яднання з Расеяй, значыць, справа Кацярыны ІІ жыве ў вярхах.

Сёння сусветны дзень **Халакосту** — у памяць пра шэсць мільёнаў габрэяў, якіх фашысты знішчылі ў часе другой Сусветнай вайны. Слова “халакост“ са старажытнагрэцкай мовы перакладаецца як знішчэнне агнём. У віленскім гета, як, дарэчы, і ў Берасці, пад памятнай табліцай памяці ахвяраў генацыду нехта намаляваў вялізную чырвоную свастыку. Але тое не выклікае ў душы пратэсту. Так мусіць быць, каб людзі адчувалі, што нехта і сёння гатовы расстрэльваць, душыць, паліць ні ў чым не вінаватых людзей. Самае страшнае, калі засынае пільнасць і здаецца, што зло пераможанае назаўсёды.

## 3 ТРАЎНЯ

Сёння нарадзіўся **Шэкспір**, і адбылося гэта ў 1564 г. Шэкспір — рэдкі класік сусветнай літаратуры, чыя спадчына амаль уся перакладзеная на беларускую мову. Прычым “Гамлет“ і “Кароль Лір“ па-беларуску кардынальна адрозніваюцца ад расейскіх перакладаў. Рэч у тым, што ў беларускай мове няма такога высакапарнага стылю, які ў Расеі з‘явіўся у час Сімяона Полацкага і Дзяржавіна, і нашы перакладчыкі — што Юрка Гаўрук,

# ТРАВЕНЬ —

што Язэп Семяжон — шукалі аналагаў ангельскіх словаў у жывой народнай гаворцы. Спецыялісты сцвярджаюць, што і Шэкспір пісаў свае творы без высакапарнасці. Таму беларускія пераклады больш блізкія да арыгіналаў. У Гаўрука і Семяжона Шэкспір атрымаўся надта ладны, жывы і зразумелы. А ў Шэкспіра вельмі прыгожая і адначасова мудрая атрымалася беларуская мова.

Трэцяга траўня 1791 г. Сойм Рэчы Паспалітай зацвердзіў **Канстытуцыю** — першую ў Еўропе, другую ў свеце і апошнюю для супольнай дзяржавы Кароны і Літвы. Нашы продкі жылі паводле гэтай канстытуцыі да захопу беларускіх земляў Расейскай імперыяй. З таго часу шмат розных канстытуцый прашалясцела над галовамі беларускага народу, ды ўсе яны былі нейкія недаробленыя і не свае, таму доўга не жылі.

Сённяшняя канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, падпраўленая Лукашэнкам на рэферэндуме 1996 года, таксама далёкая ад дасканаласці і ад той краіны, якой быццам бы служыць. Шмат хто ў нас гэта разумее, але зрабіць нічога не можа. Усё адно, што з даждџом змагацца.

## 4 ТРАЎНЯ

Такім самым травеньскім днём у 1881 г. нарадзіўся расейскі рэвалюцыянер **Аляксандр Керанскі,** якому не ўдалося ў свой час захаваць уладу ад бальшавікоў, у выніку чаго ўсё XX стагоддзе Расея больш займалася самазнішчэннем, а не будаўніцтвам, і толькі цяпер, магчыма, вяртаецца да таго, чым займаўся Часовы ўрад пад кіраўніцтвам Керанскага.

А ў Велікабрытаніі 4 траўня 1979 г. прыступіла да абавязкаў першая ў гісторыі краіны жанчына прэм'ер-міністр **Маргарэт Тэтчар**. У Беларусі жанчыны прэм'ерамі не былі ніколі.

## 5 ТРАЎНЯ

5 траўня 2002 г. – **Вялікдзень** (па календары праваслаўнай канфесіі). На Вялікдзень ладзілі шчодры стол, абавязковым атрыбутам якога былі чырвоныя яйкі, свянцоныя пірагі, сыр, каўбасы, вяндліна і іншая скароміна.

Яйка ўвасабляла космас і служыла сімвалам жыцця, яго чырвоны колер нагадваў аб ахвярнай крыві Ісуса Хрыста. Пафарбаваныя яйкі, яешня, сыр, хлеб, куцця, печыва, розныя прысмакі, "гарачыя" напоі былі абавязковымі і ў дзень Радаўніцы.

Памінальны стол ладзілі "на дзядах", пакрываючы ўладкаваныя магілкі чыстымі абрусамі; яйкі, лусту хлеба, кавалачак сыру адкладвалі дзядам, пакідаючы іх на магілцы пасля трапезы.

А яшчэ ўзгадваюцца кадры са стужкі Юрыя Хашчавацкага, на якіх Лукашэнка заходзіць у царкву на Вялікдзень і яго вітаюць прыхаджане: «Хрыстос уваскрос». На што праваслаўны атэіст шчыра адказваў: «Спасибо, спасибо!». Вось жа можа хутка будзе новая традыцыя. Згодна адпаведнага ўказа.

## 8 ТРАЎНЯ

Сёння ў 1945 г. фельдмаршал Кейтэль падпісаў **капітуляцыю** фашысцкай Нямеччыны. У большасці краінаў менавіта гэты дзень святкуецца як Дзень перамогі ў Еўропе.

Сёння адзначаецца Сусветны дзень Чырвонага крыжа і Чырвонага паўмесяца.



У гэты дзень у 1429 г. французы на чале з Жанай д'Арк знялі аблогу роднага горада Жаны — Арлеана. І гэта быў рашучы пералом у Стогадовай вайне. Што было потым, будзе потым. Сёння ж французы цепляць у сваіх сэрцах радаснае пачуццё перамогі. Павіншуем іх з гэтым.

Восьмага траўня 1999 г. знік **Юры Захаранка.**



Дзяржаўныя органы за гэты час не прасунуліся ні на крок у росшуку былога міністра ўнутраных справаў, а пасля аднаго з лідэраў апазіцыі. Жонка Захаранкі перакананая, што яе мужа самым брутальным чынам забілі паплечнікі Лукашэнкі. А на гэтым здымку ён яшчэ побач з Віктарам Шэйманам, сённяшнім генеральным пракурорам Беларусі.

## 15 ТРАЎНЯ



15 траўня – Сусветны Дзень Сям'і, які адзначаецца па ініцыятыве ЮНЭСКА.

15 траўня ў 1882 г. нарадзіўся беларускі акцёр і драматург **Уладзіслаў Галубок**. Яго імя добра вядомае ў культурным асяроддзі беларусаў, асабліва сярод дзеячаў беларускай сцэны. З дзіцячых гадоў ён прабіваў сабе шлях да святла, ведаў, культуры. "У 1896 г. за грошы, зробленыя на выгрузцы дроў, я набыў білет на галёрку мінскага тэатра. Там і ўзнікла ў мяне думка стаць артыстам..." – расказваў сам Галубок. І ён стаў артыстам, драматургам, арганізатарам вандроўнага тэатру, які з 1932 г. называўся Беларускім трэцім дзяржаўным тэатрам.

Вандроўны тэатр пабываў са сваімі спектаклямі ў самых розных кутках Беларусі. Галубок адначасова выконваў абавязкі мастака-дэкаратара, музыканта-выканаўцы і рэжысёра. Аснову рэпертуару складалі яго п'есы: "Пан Сурынта", "Ганка", "Плытагоны", "Пінская Мадонна", "Васіль Хмель", у якіх раскрываецца барацьба беларускага народа за права "людзьмі звацца". Тэатр Галубка карыстаўся выключнай папулярнасцю ў гледачоў.

Ул. Галубок любіў жыццё і людзей, быў сам узнагароджаны ўсенароднай любоўю. Нездарма ён – першы артыст БССР.

А вось лёс яго быў тыповым для нацыянальных дзеячаў Беларусі. Адхілены ад усіх пасадаў, у 1937 г. ён быў рэпрэсіраваны, і, паводле афіцыйнай версіі, памер у няволі ад гіпертанічнай хваробы.

Гэты дзень у гісторыі адзначаны нараджэннем не толькі рэальных людзей, але і вобразаў. Гэтак у 1928 г. менавіта у гэты дзень упершыню на экранах з'явіўся герой мульцікаў **Мікі Маус.**

Аднак 15 траўня не толькі нараджаліся або паміралі і ўвогуле рабіліся не толькі стваральныя рэчы. Гэтак у 1932 г. Сталін падпісаў дэкрэт, якім абвяшчалася **"бязбожная пяцігодка"**. І пачалося. Выкідалі з хатаў абразы, палілі цэрквы, арыштоўвалі і ссылалі святароў. Чамусьці на месца абразоў тады асабліва папулярна было вешаць партрэт барадатага Карла Маркса. Феномен масавага бязбожніцтва застаецца неразгаданай таямніцай. Няхай сабе ў нас у Беларусі, дзе за гісторыю адна акупацыя змяняла другую, а разам з імі і людзей прымушалі мяняць веру, можна зразумець рэлігійную абыякавасць. Але ж у «ісцінна» праваслаўнай Расеі, якую самі расейцы называлі трэцім Рымам, такое масавае адмаўленне ад Бога выглядае дзіўным. Тым больш цяжка прыняць на веру сённяшняе масавае захапленне расейцаў рэлігіяй.

А яшчэ ў гэты дзень у 1941 г., паводле плана "Барбароса" Нямеччына павінна была напасці на Савецкі Саюз. Напад адклалі на шэсць тыдняў.

У 1971 г. у Лондане адчынілася беларуская **бібліятэка імя Францішка Скарыны** — унікальны збор беларусазнаўчай літаратуры, роўнага якому паводле падбору кніг і дакументаў, здаецца, няма і ў самой Беларусі.

15 траўня ў 1988 г. пачаўся вывад савецкіх войскаў з Афганістана.

## 16 ТРАЎНЯ

У 1717 г. 16 траўня **Вальтэра** пасадзілі ў Бастылію за ягоныя сатырычныя вершы. Мабыць, цяпер у Францыі паэтаў турмою не караюць. А вось у Беларусі гэта магчыма. Згадаем, што Славамір Адамовіч правёў за кратамі дзесяць месяцаў за свой верш пра Лукашэнку. Пасля адсідкі Славамір апынуўся ў Амерыцы, падаўся на заробкі. Клаў кладку на новым хмарачосе на Манхэтэне, у самым цэнтры Нью-¨рку.



**Славамір Адамовіч**

Таксама ў Амерыцы, але на поўдні ЗША, у Атланце жыве славутая беларуская гімнастка, шматразовая чэмпіёнка **Вольга Корбут**. Сёння ў яе

*Ад прадзедаў, спакон вякоў... (Я. Купала)*

# СОНЦАМ САГРЭТЫЯ ДНІ

дзень нараджэння — 16 траўня 1955 г.

16 траўня 1985 г. **Міхаіл Гарбачоў** падпісаў "сухі закон". Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР называлася "Аб мерах па пераадоленні п`янства і алкагалізму і выкараненні самагонаварэння". Шмат тады з гэтай нагоды было і смеху, і саркастычных кпінаў, і перабору ў імкненні дагадзіць уладам. Памятаеце безалкагольныя вяселлі? Мінуў час, а самагонаварэнне не толькі не выкаранілі ў вёсцы, яно яшчэ і шырокім крокам прыйшло ў горад.

### 21 ТРАЎНЯ



21 траўня 1841 г. памёр **Юльян Нямцэвіч**, выдатны беларускі гісторык, пісьменнік і публіцыст. Нарадзіўся ён пад Берасцем, у маёнтку Скокі, скончыў Берасцейскі езуіцкі калегіум. Затым вучыўся ў кадэцкім корпусе ў Варшаве. У часе паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Касцюшкі стаў ягоным ад'ютантам. І разам жа з Тадэвушам Касцюшкам быў зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. І выйшлі яны з вязніцы разам. У 1796 г. Нямцэвіч быў паехаў у Амерыку, дзе жыў да 1807 г., потым зноў вярнуўся на Бацькаўшыну. Тут ён узяў удзел у вайне супраць расейцаў у 1831 г. Калі і гэтае паўстанне было задушанае, ён ад'ехаў у Францыю. Там жа і выйшлі ягоныя літаратурныя творы. Перадусім гэта раманы "Два паны Сяцехі" і "Ян з Тэнчына", а таксама колькі камедыяў і патрыятычны паэтычны цыкл " Гістарычныя песні". Пакінуў багата ўспамінаў, у якіх цікава і маляўніча апісаў Беларусь і яе гарады – Навагрудак, Берасце, Горадню, Слонім ды іншыя. Вялікую дакументальную каштоўнасць уяўляюць сабою ягоныя "Літоўскія лісты", напісаныя падчас вайны 1812 г.

21 траўня 1869 г. на Случчыне нарадзіўся **Канстанцін Валасовіч**, беларускі прыродазнаўца, геолаг, географ і хімік. Скончыў ён Варшаўскі універсітэт. Сярод ягоных навуковых подзвігаў ёсць і гэткі – ён збярог шкілет Ляхаўскага мамантa, аднаго з першых, што сталі вядомыя навуцы. Цяпер шкілет той захоўваецца ў Парыжы, у Французскім нацыянальным музеі прыроды. А наогул Канстанцін Валасовіч уважаецца за заснавальніка так званай чацвярцічнай геалогіі і палеаграфіі Паўночнай Еўразіі. Імем славутага беларускага навукоўца названыя выспы ў архіпелагу Паўночная Зямля, а таксама шэраг выкапнёвых жывёлаў ды раслінаў.



21 траўня 1894 г. на Браншчыне нарадзіўся **Мікалай Галадзед**, адзін з заснавальнікаў камуністычнай партыі ў Беларусі, савецкі дзяржаўны дзеяч. Удзельнічаў у расейскай рэвалюцыі 1917г. і грамадзянскай вайне. Быў другім сакратаром Кампарытыі Беларусі. Ад траўня 1927 г. і да траўня 1937-га, роўна 10 гадоў узначальваў ён Савет Народных Камісараў БССР. Апарат кіравання кампартыі стаўся часткаю дзяржаўнага апарату, якая вызначала асноўныя кірункі дзяржаўнага развіцця і кантралявала іх выкананне. Менавіта ў гэтым і палягала «кіраўнічая роля» партыі, бо шэраговыя камуністы ніяк не ўплывалі ні на партыйную, ні на дзяржаўную палітыку. Мікалай Галадзед быў арыштаваны НКВД у Маскве і падчас допыту ў Менску выкінуўся з акна на вуліцу. У гэты самы дзень.

У выніку камуністычных рэпрэсіяў у 1937-1938 гг. Беларусь была «ачышчана» ад «контррэвалюцыйных элементаў і шпіёнаў». Толькі пры «выкрыцці» гэтак званага «Аб`яднанага антысавецкага падполля» асуджана больш за 2,5 тысячы чалавек, значная частка з іх расстраляна. У 1937-1938 гадах праводзілася масавая акцыя «па выкрыцці» польскіх, нямецкіх і латышскіх «шпіёнаў». Было арыштавана каля 23,5 тысяч чалавек, больш як 21 тысяча з іх расстраляна. Рэпрэсіі 1938 года закранулі ўсе пласты грамадства, у тым ліку і арганізатараў гэтых рэпрэсіяў. Былі арыштаваныя 99 сакратароў райкамаў КПБ са 101, больш за 50 старшыняў райвыканкамаў, сакратары ЦК КПБ. Выглядае, што стваральнікі апарату гвалту ў Беларусі самі ж і сталі яго ахвярамі. Адным з такіх быў Мікалай Галадзед.

### 22 ТРАЎНЯ

22 траўня 1863 г. адбылася сеча пад **Мілавідамі** паміж беларускімі паўстанцамі і расейскімі карнікамі. Мілавідская бітва ўвайшла ў гісторыю паўстання Кастуся Каліноўскага як адна з самых вялікіх. Тады тут загінула і было паранена блізу 50 паўстанцаў, а расейцы згубілі ўдвая болей жаўнераў і мусілі адступіць. Напярэдадні гэтай падзеі ў навакольных лясах сыйшлося немалое паўстанцкае войска, якое складалася са Слонімскага, Гарадзенскага, Навагрудскага і Пружанскага атрадаў, агулам блізу 800 чалавек. 20 траўня паўстанцкі лагер інспектаваў сам Кастусь Каліноўскі. Нягледзячы на тое, што ў расейцаў была значная перавага ў колькасці і ў зброі, яны былі разбітыя і змушаныя адступіць. Наступнай раніцай на дапамогу расейскаму палку былі пасланыя з Нясвіжа яшчэ дзве роты, але паўстанцы сыйшлі ў лясы, забраўшы сваіх параненых і забітых таварышаў...

Паўстанне 1863 года было наогул з нешматлікіх у гісторыі XIX стагоддзя прыкладаў, калі, па сутнасці, купка ўзброеных людзей, абараняючы сваю чалавечую і нацыянальную годнасць, паўстала супраць велізарнай імперыі. У 1930 г. на месцы бою пад Мілавідамі была пастаўленая мемарыяльная капліца, што стаіць там і цяпер. Напэўна сёння там будуць пакладзеныя жывыя кветкі. Вечная памяць героям!



22 траўня 1900 г. у маёнтку Ізабэлёва пад Пухавічамі нарадзіўся **Мікола Каспяровіч,** выдатны беларускі этнограф, мовазнаўца, даследчык літаратуры. ¨н скончыў Менскі інстытут народнай асветы ў 1921г. Ад 1926-га працаваў на пасадзе навуковага сакратара Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інстытуце беларускай культуры і сакратаром краязнаўчага часопіса "Наш край". ¨н напісаў і выдаў агулам больш за 230 навуковых працаў па розных тэмах. У абсягі ягоных інтарэсаў траплялі пытанні мастацтвазнаўства, літаратуры, тэатру, краязнаўства, філалогіі ды асветы. Выдаў Мікола Каспяровіч і некалькі слоўнікаў беларускай мовы. Але большасць ягоных навуковых працаў, што гэтак і засталіся ў рукапісах, была знішчаная камуністамі пасля ягонага арышту.

«Гульня ў незалежнасць», якую бальшавікі выкарысталі для ўтрымання ўлады ў нацыянальных рэспубліках, скончылася. У канцы 1929 - пачатку 30-х гадоў найбольш актыўныя дзеячы беларусізацыі былі выключаныя з партыі, а пасля арыштаваныя. І хоць палітыка беларусізацыі не была адмененая, выконваць яе цяпер трэба было шляхам «інтэрнацыянальнага выхавання». У 30-я гады змянілася і канцэпцыя нацыянальнай палітыкі. Было канстатавана, што расейцы дапамаглі адсталым народам і цяпер з'яўляюцца для іх «старэйшымі братамі». Расейскае і савецкае робяцца сінонімамі, расейская культура - перадавой, расейская гісторыя - гераічнай. Арыштавалі Міколу Каспяровіча яшчэ ў 1930-м годзе і зняволілі на 5 гадоў. Пасля турмы ён мусіў жыць у выгнанні ажно ў Новасібірску, дзе давялося яму выкладаць расейскую мову. Але і там яго не пакінулі ў спакоі маскоўскія каты. У 1937-м ён быў арыштаваны паўторна і расстраляны.

### 23 ТРАЎНЯ



23 траўня 1871 г. у баі загінуў генерал Парыжскай Камуны **Яраслаў Дамброўскі**.

Нарадзіўся ён у Жытоміры на Украіне, а вучыўся на Беларусі, скончыў кадэцкі корпус у Берасці, а затым і ў Пецярбургу, дзе скончыў Акадэмію генеральнага штабу ў 1861-м. Дамброўскі быў адзін з найбольш радыкальных кіраўнікоў паўстання 1863 года.

Зямлю, на ягоную думку, як і на думку найбольш дэмакратычнай часткі паўстанцаў, меркавалася перадаць сялянам без выкупу. Гэтая акалічнасць ад самага пачатку паўстання падзяліла яго кіраўнікоў на «чырвоных», прыхільнікаў радыкальных зменаў, і «белых», гатовых да кампрамісу з царызмам. Кансерватыўная пазіцыя «белых», якія не хацелі ісці на саступкі сялянам, спрычынілася да звужэння сацыяльнай базы паўстання. Менавіта Яраслаў Дамброўскі ўзначаліў яшчэ ў пачатку 1862-га ўрад чырвоных у Варшаве, у той час, як лідэрам "чырвоных" у Беларусі і Літве быў Кастусь Каліноўскі.

У 1864 г., пасля арышту, расейцы адправілі Дамброўскага на катаргу, адкуль ён уцёк у Еўропу. У красавіку 1871 г. ён быў абраны генералам Парыжскай камуны, узначаліўшы ўвесь збройны супраціў камунараў. Адважны камандзір, палымяны змагар за свабоду загінуў са зброяй у руках. У гэты самы дзень, 131 год таму.

ГІСТАРЫЧНЫ КАЛЯНДАР

# ТРАВЕНЬ –



23 траўня 1946 г. пакінуў наш свет **Кастусь Езавітаў** — выбітны беларускі палітычны і грамадскі дзеяч.

А нарадзіўся ён у 1893 г. у Дзвінску. Скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут і Паўлаўскую вайсковую вучэльню. Яшчэ ў 1913 г. Езавітаў стаў сябрам Беларускай Сацыялістычнай Грамады. У першую Сусветную вайну праводзіў актыўную работу сярод жаўнераў-беларусаў Паўночнага фронту. За ўдзел у працы Першага Усебеларускага кангрэсу і дзейнасць дзеля стварэння беларускага войска ў студзені 1918 г. быў арыштаваны бальшавікамі, але здолеў уцячы з астрогу. 25 сакавіка 1918 г. Кастусь Езавітаў удзельнічаў у абвяшчэнні незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі, уваходзіў у склад яе Рады як міністр абароны. Затым ён быў кіраўніком Вайскова-дыпламатычнай місіі БНР у Латвіі ды Эстоніі. Наладзіў дыпламатычныя дачыненні беларускага ўраду з урадамі Украіны, Літвы, Латвіі, Эстоніі ды Фінляндыі, звяртаўся з просьбай аб вайсковай дапамозе да ўраду ЗША. У траўні 1920 г. «за выдатную працу на карысць Беларускай Народнай Рэспублікі» атрымаў званне генерал-маёра. У 1921-1944 гг. жыў у Латвіі. Ён быў тут намеснікам старшыні таварыства «Бацькаўшчына» ў Латгаліі, узначальваў беларускае выдавецтва, таварыствы беларусаў-вышчыкаў, беларускіх настаўнікаў, навукова-краязнаўчае. Браў удзел у Пражскай і Берлінскай палітычных канферэнцыях. Рэдагаваў газету «Голас беларуса» і часопіс «Беларуская школа ў Латвіі». За сваю нацыянальную працу чатыры разы арыштоўваўся латвійскімі ўладамі. Выпрабаванні лёсу не змусілі мужнага генерала здрадзіць абраным ідэалам. У другую Сусветную вайну ён знаходзіўся сярод тых, хто спрабаваў выкарыстаць барацьбу імперыяў-монстраў дзеля адраджэння сапраўды незалежнай беларускай дзяржавы. Езавітаў быў схоплены савецкай вайсковай контрразведкай у красавіку 1945 г. Паводле афіцыйнай версіі, памёр ад сухотаў 23 траўня 1946 г. падчас следства. Насамрэч яго пасля жорсткіх катаванняў расстралялі. Кастусь Езавітаў напісаў шэраг кніг і артыкулаў па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху, беларусазнаўстве, ён аўтар арыгінальных пачуццёвых вершаў, укладальнік школьных дапаможнікаў. Меў багаты кнігазбор, падрыхтаваў да друку невядомыя раней творы Максіма Багдановіча.

23 траўня 1980 г. памерла **Ларыса Александроўская**, слынная беларуская оперная спявачка і рэжысёрка. Народная артыстка Беларусі. Незвычайная мастацкая адоранасць, цудоўны галассапрана і драматычны тэмперамент абумовілі яе вялікі поспех. Не толькі на сцэне. Ларыса Александроўская заслужыла сапраўдную ўсенародную любоў. Пасля яе смерці, з 1987 г. ў Беларусі праводзяцца нацыянальныя конкурсы вакалістаў імя Александроўскай, а ў 1992-м яе імя нададзена прэміям у галіне тэатральнага мастацтва...

## 24 ТРАЎНЯ

24 траўня – Дзень славянскага пісьменства і культуры.



24 траўня 1173 года памерла **Ефрасіння Полацкая**. Яна прыйшла на свет на пачатку XII ст. у Полацку, у сям'і князя Святаслава-Георгія і даводзілася ўнучкай найславуцейшаму з полацкіх валадароў - Усяславу Чарадзею. Дзяўчынку назвалі старажытным полацкім імем Прадслава. Слава пра розум і прыгажосць полацкай князёўны разнеслася далёка. Калі Прадславе споўнілася дванаццаць гадоў (у такім веку дзяўчынка ўжо лічылася тады нявестаю), у Полацак зачасцілі сваты. Бацькі меркавалі выдаць князёўну замуж за сына нейкага слаўнага сваім багаццем і княжаннем уладара. Аднак Прадслава абрала сабе іншы шлях: пастанавіўшы стаць Хрыстоваю нявестаю, яна прыйшла ў манастыр і прыняла пострыг пад імем Ефрасінні. Спачатку маладая манашка пасялілася ў келлі Сафійскага сабору. Тут яна перапісвала і перакладала з іншых моваў кнігі і, як лічаць некаторыя гісторыкі, вяла Полацкі летапіс. Праз колькі гадоў духоўнага ўдасканалення яна заснавала ў Полацку жаночы, а затым і мужчынскі манастыры. Пры іх Ефрасіння адчыніла скрыпторыумы - майстэрні перапісвання кніг, а таксама школы, у якіх дзеці авалодвалі граматай, вучылі гісторыю, грэцкую і лацінскую мовы, спасцігалі навуку красамоўства. Асветніца збірала вакол сябе таленавітых людзей, і таму яе можна назваць нашай першай мецэнаткаю. На яе заказ полацкі дойлід Ян пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, а ювелір Богша (хрысціянскае імя Лазар) стварыў крыж - бясцэнную святыню беларусаў. Унучка Усяслава Чарадзея ўздымала свой голас супраць княжаскіх міжусобіц, папярэджвала, што братазабойчыя войны могуць прывесці Бацькаўшчыну да гібелі. На схіле жыцця Ефрасіння вырашыла здзейсніць духоўны вычын паломніцтва ў Святую Зямлю.

У канцы красавіка 1167 г. ігумення і яе спадарожнікі сястра Еўпраксія і брат Давыд дасягнулі ерусалімскіх муроў. Там Ефрасіння папрасіла Госпада, каб дазволіў ёй памерці ў Святым горадзе, дзе адбылося збавенне чалавечага роду. У хуткім часе яна занядужала, на дваццаць чацвёрты дзень хваробы сканала і была пахаваная ў Ерусаліме ў Феадосіевым манастыры Святой Багародзіцы. Мошчы святой Ефрасінні спачываюць цяпер у Спасаўскай царкве полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра.

24 траўня 1542 г. **Станіслаў Давойна** стаў полацкім ваяводам. Гэта быў надзвычай цікавы персанаж нашай гісторыі. Сын старасты з Мерача, у 1528-м стаў ён каморнікам каралевы Боны. У 1553-м узначальваў пасольства Вялікага Княства ў Маскву. А ў 1563-м ён ужо кіраваў абаронаю свайго Полацка ад войскаў маскоўскага цара Івана Жахлівага. Абаронцы гораду маглі б вытрымаць доўгую аблогу, каб не памылкі полацкага ваяводы Станіслава Давойны. Першы раз ён памыліўся, выправіўшы з гораду, каб паменшыць колькасць едакоў, дзве тысячы сялянаў, што ўмацоўвалі сцены. Царскія людзі палавілі іх і прымусілі паказаць лясныя ямы з гарадскімі запасамі збожжа. Другі раз Давойна схібіў, калі адвёў абаронцаў у замак і падпаліў астрог з пасадамі. Пад прыкрыццём густога дыму стральцы ўварваліся ў места і перацягнулі туды гарматы. Цар расейскі дэклараваў пакінуць абаронцам Полацка волю і маёмасць. Ваявода Давойна, забыўшыся, што дзяржаўнага слова ў Маскоўшчыне ніколі не трымалі, выступіў з фартэцыі з усім войскам і артылерыяй. Пасмяяўшыся з веры палачанаў у ягоныя абяцанні, цар Іван Жахлівы акружыў палонных моцнай аховаю і загадаў пяць дзён не даваць ім есці. Полацак быў знішчаны дашчэнту. Большасць ягоных жыхароў была пазабіваная расейцамі. Ваяводу Давойну з жонкаю і дзецьмі, епіскапа Арсеня, знаных полацкіх шляхцічаў Нёміровіча, Корсака, Ешманаў ды іншых цар адправіў у Маскоўшчыну. Разам з імі ў Расею ў рабства было выведзена 50 тысячаў палонных. Сам жа Станіслаў Давойна вярнуўся на радзіму толькі праз 4 гады. А вось жа астатнія беларусы, якіх Іван Жахлівы, цар маскоўскі забраў у палон, ніколі не вярнуліся дахаты... А ў 1569 г. Станіслаў Давойна браў чынны ўдзел у працы Люблінскага Сойму. Гэтак Расея, праз драпежнасць і крыважэрнасць сваіх цароў, падштурхнула нашых продкаў да уніі з Польшчаю.

## 27 ТРАЎНЯ

27 траўня 1871 г. у Парыжы быў расстраляны версальцамі **Кастусь Далеўскі**. Ён паходзіў са стражытнага шляхецкага роду. Нарадзіўся ў бацькавым фальварку Канкулка на Лідчыне. Ягоныя браты, Аляксандр ды Францішак, былі стваральнікамі Братняга саюза літоўскай моладзі, за што паатрымоўвалі ад расейцаў сібірскую катаргу. Па вяртанні з Сібіры яны далучыліся да кіраўніцтва паўстання Кастуся Каліноўскага. Іх малодшы брат Тытус быў найбліжэйшым памочнікам кіраўніка. А сястра Апалонія была жонкаю Зыгмунта Серакоўскага.

Сам Кастусь Далеўскі пасля вучобы ў Пецярбургскім ды Маскоўскім універсітэтах далучыўся да сваіх крэўных падчас таго вялікага паўстання. Ад 1863 г. ён быў камандзірам паўстанцкага атраду на Ковеншчыне. Пасля паразы паўстанцаў здолеў перабрацца ў Францыю, дзе пасябраваў з Дамброўскім і далучыўся да парыжскіх камунараў. Гэтак і загінуў, баронячы справу свабоды.



27 траўня 1900 г. у вёсцы Макашы, што раскінулася над ракой Вушой, непадалёк ад чыгуначнай станцыі Гарадзея, нарадзіўся **Уладзімір Жылка**, выдатны беларускі паэт. Школы ў родных Жылкавых Макашах не было, першую навуку хлопчык спасцігаў спачатку ў Гарадзейскай царкоўнапрыходскай школе, а потым у Мірскай гарадской вучэльні. Чатырнаццацігадовым падлеткам трапляе ён у Менск, куды бацька, патомны селянін, адважыўся пераехаць на стала, атрымаўшы месца гандляра ў царкоўнай краме. У 1916 годзе Уладзімір закончыў Слонімскую вышэйшую пачат-

# СОНЦАМ САГРЭТЫЯ ДНІ

ковую школу. Вучэльні падобнага кшталту мелі агульнаадукацыйны характар і давалі права паступлення ў спецыялізаваныя навучальныя ўстановы. І Уладзімір выкарыстоўвае гэтае права - паступае ў Ковенскую сельскагаспадарчую вучэльню.

Рэвалюцыйны 1917 год Жылка сустрэў у Менску, дзе трапіў у вір палітычных падзеяў. Жывучы ў цэнтры горада, ён меў магчымасць ледзь не штодня назіраць шматлюдныя мітынгі, бачыць касцёльныя працэсіі пад польскімі нацыянальнымі сцягамі. Як назіральнік трапіў Жылка і на Першы Усебеларускі кангрэс. У лютым 1919 года Уладзімір Жылка захварэў. Трохі ачуняўшы, паэт падаўся да сваякоў на вёску. Некалькі месяцаў пажыў у бацькавых крэўных у Клецішчы на Случчыне, потым перабраўся да матчынай радні ў Падлессе. А калі Падлессе ў выніку падзелу Беларусі ў 1921 годзе апынулася пад Польшчай, паэт пераехаў у Вільню.

У Вільні ён блізка сышоўся з Антонам Луцкевічам, які займаў пасаду старшыні Беларускага нацыянальнага камітэту і якога паэт у лістах з Прагі будзе называць «даражэнькім дзядзькам». Ратуючы паэта ад польскіх вышуковых службаў, Луцкевіч пасылае яго з даручэннем у Коўна, дзе на той час знаходзіўся ўрад БНР. З Коўна Жылка накіраваўся ў Бірштаны - падлячыцца ў санаторыі, адпачыць там ад надакучлівай палітыкі, якая апошнім часам спрабавала залучыць паэта ў свае цянёты. З Бірштанаў Жылка трапляе ў Дзвінск, дзе спрабуе скончыць апошні клас Беларускай гімназіі. Жыве там ён на кватэры дырэктара І.Краскоўскага. Але неўзабаве ён пакідае Дзвінск і вяртаецца ў Вільню. У 1923 годзе, пры спрыянні Леапольда Радзевіча, Жылка выехаў на вучобу ў Пражскі універсітэт - як стыпендыят чэхаславацкага ўраду. Пасля сканчэння універсітэта Жылка адважыўся перабрацца ў савецкую Беларусь. У Менску ён прымае савецкае грамадзянства, працуе літсупрацоўнікам у «Звяздзе», перакладчыкам на Белдзяржкіно, выкладчыкам у музычным тэхнікуме. Пры газеце, дзякуючы Жылку, пачынаюць гуртавацца маладыя таленавітыя пісьменнікі, перыядычна з'яўляецца літаратурная старонка. На Белдзяржкіно паэт перакладае фільмы на беларускую мову. Здавалася б, жыццё пачынае ўваходзіць у патрэбную каляіну. Але, Уладзіміра Жылку арыштавалі 18 ліпеня 1930 года. ¨н адмовіўся падпісаць акт абвінавачвання аб сваёй прыналежнасці да Саюза вызвалення Беларусі. Пасля медычнага агляду чэкістам стала зразумела - у турэмных умовах падследны можа не дажыць да абвяшчэння прысуду. Праз месяц пасля арышту Жылку вызваляюць з-пад варты. На волі паэту пабыць давялося нядоўга. Неўзабаве яго зноў арыштавалі і 10 сакавіка 1931 года абвясцілі судовы вырак - пяць гадоў высылкі ў горад Уржум Кіраўскай вобласці. Адсюль ён ужо не вярнуўся. 1 сакавіка 1933 года паэт памёр. Памятаеце яго-ныя радкі:

Калі сябры нас губяць згубаю
І ворагі прарочаць скон
Тады к Табе, о Вільня любая,
прыводзяць згадкі у палон...

Падхапіўшы Луцкевічаву метафару пра Вільню як Меку, а Менск, як Медыну, Жылка гукаў да паходу. У гэтай метафары ёсць яшчэ адзін неабходны персанаж — постаць Прарока. Яго прагна імкнуўся разгледзець паэт:

“Між тых, хто ўцяклі да Медыны,
Ці бачыш, ці бачыш яго?“

Прарок не прыйшоў. Але паэтава прароцтва, як і прароцтва Луцкевіча, засталося. За тыя гады, што праміналі, нішто не замяніла беларусам Вільні. І нішто не адменіць тых прароцтваў.

**Гістарычны сектар**

*АБ'ЯВЫ*

## ФОНД ГОТЛІБА ДАЙМЛЕРА І КАРЛА БЕНЦА - МАЛАДЫМ АСПІРАНТАМ

Фонд Готліба Даймлера і Карла Бенца садзейнічае маладым аспірантам у правядзенні даследаванняў у нямецкіх інстытутах. З гэтай мэтай штогод выдзяляюцца стыпендыі па любых дысцыплінах і кірунках.

Прэтэндэнты павінны прадставіць свой уласны праект ці праект, створаны ў супрацоўніцтве з прымаючай арганізацыяй. Узрост кандыдата не павінен перавышаць 30 год. Апошнюю навуковую ступень (магістарскую ці спецыяліста) кандыдат павінен атрымаць не больш года таму.

Стыпендыя прызначаецца на 2 гады. Трэці год можа фінансавацца толькі праз пазыку фонду.

**Памер стыпендыі** - 1500 марак у месяц.

**Тэрміны падачы заяваў** - 1 красавіка і 1 кастрычніка.

Пасля папярэдняга адбору прэтэндэнты запрашаюцца на семінар у Ладэнбург (Германія), дзе яны персанальна прадставяць свае праекты.

Тым стыпендыятам, якія па фінансавых прычынах не змогуць прыехаць на семінар, можа быць прысуджаная прэмія на 3 месяцы, каб яны маглі пачаць свой праект. Канчатковае рашэнне аб поўнай стыпендыі прымаецца пасля прадстаўлення праекта на больш познім семінары ў час знаходжання стыпендыята ў Германіі.

Дадатковая інфармацыя: Міждзяржаўная асацыяцыя паслядыпломнай адукацыі (Расія, Масква), тэл. (095) 434-24-38.

## ПАПЯРЭДЖАННЕ БАРАНАВІЦКАМУ ГРАМАДСКАМУ АБ'ЯДНАННЮ

Упраўленне юстыцыі Берасцейскага аблвыканкаму вынесла пісьмовае папярэджанне баранавіцкаму грамадскаму аб'яднанню Агенцтва рэгіянальнага развіцця “Варута”.

Фармальнай падставай для папярэджання паслужыла неправільнае напісанне назвы арганізацыі, выкарыстанне незарэгістраванага лагатыпу, а таксама згадка ў бюлетэні “Варуты” пра незарэгістраванае аб'яднанне “Дзедзіч”.

Агенцтва “Варута” выконвае ролю рэсурсавага цэнтра і на сёння з'яўляецца найбольш уплывовай арганізацыяй у трэцім сектары баранавіцкага рэгіёну. Кіраўніцтва аб'яднання асцерагаецца, што да “Варуты” будзе ўжыты той жа сцэнар, што да берасцейскага цэнтра грамадзянскіх ініцыятываў “Вежа”. Нагадаем, што пасля вынясення двух пісьмовых папярэджанняў Берасцейскае ўпраўленне юстыцыі праз суд запусціла працэс ліквідацыі “Вежы”.

**Паводле Радыё СВАБОДА**

*АБ'ЯВЫ*

Нядзеля, 28 красавіка,

ПАЛАЦ КУЛЬТУРЫ

канцэрт беларускага рок-гурта

**NRM**

Пачатак у 19 гадзін.

СЛУХАЙЦЕ САПРАЎДНУЮ БЕЛАРУСКУЮ МУЗЫКУ!

АБ'ЯВЫ

# ЛЕТНІК ПА ВЫВУЧЭННІ АНГЕЛЬСКАЙ МОВЫ

Арганізацыя “Масты да адукацыі” («Bridges for Education” - BFE) у чарговы раз ладзіць у Беларусі летнік па вывучэнні ангельскай мовы. Летнік будзе праходзіць з 1 па 21 ліпеня 2002 года.

По пытаннях удзелу неабходна звяртацца:

– групавы лідэр BFE Генры Лігас (Henry Ligas), e-mail: hwligas@sympatico.ca;

– Святлана Пакелева, праграмны дырэктар летніка, каардынатар праграм UNESCO альбо Аляксандр Каранкевіч, прэзідэнт Беларускай асацыяцыі клубаў UNESCO, тэл./факс: (017) 246-25-55, факс: (017) 255-21-21 (офіс UNESCO), e-mail: belau@user.unibel.by;

– школа для глухіх: вул. Шырокая, 50, пас. Ждановічы, Менск, 224033, Беларусь, тэл.: (017) 509-92-48, 509-92-49, 509-52-70;

– Вольга Кліманович (USIS): Калініградскі завулак, 18а, Менск, 220012, Беларусь, тэл.: (017) 217-04-81, факс: (017) 217-88-28, e-mail: olga@usia.minsk.by.

Дадатковая інфармацыя таксама на сайце www.bridges4edu.org.

“Масты да адукацыі” былі заснаваныя ў 1994 годзе як саюз грамадскіх арганізацый з мэтай павелічэння дапамогі ў адукацыйнай сферы краінам Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. З лета 1994 года “Масты да адукацыі” набіраюць валанцёраў для навучання размоўнай ангельскай мове ў краінах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

За час свайго існавання арганізацыя правяла 66 летнікаў, у якіх удзельнічалі прыкладна 750 выкладчыкаў з васьмі краін, што навучалі блізу 8500 студэнтаў з 33 краін.

# МАЛЫЯ ГРАНТЫ АД COTTONWOOD FOUNDATION

COTTONWOOD FOUNDATION прапануе праграму малых грантаў арганізацыям, для якіх сума ў 1000 даляраў можа забяспечыць сур'ёзныя змены. Прыклады дзейнасці, якая фінансуецца: пасадка дрэваў, азеляненне; набыццё зямлі; будаўніцтва; набыццё інструментаў, абсталявання, насення, жывёлаў; правядзенне трэнінгаў; узнаўленне экасістэм; набыццё альтэрнатыўных сістэм выпрацоўкі электраэнергіі. Таксама фінансуюцца праекты, скіраваныя на агульную падтрымку дзейнасці, асабліва для арганізацый з малымі бюджэтамі.

Фонд мае абмежаваны бюджэт, таму фінансавацца будуць праекты, якія адпавядаюць усім пералічаным ніжэй крытэрыям: абарона навакольнага асяроддзя; распаўсюджванне і садзейнічанне развіццю культурнай разнастайнасці; забяспячэнне асноўных патрэбаў людзей; выкарыстанне ў сваёй дзейнасці працы валанцёраў.

Да ўдзелу запрашаюцца толькі дабрачынныя і некамерцыйныя арганізацыі, як зарэгістраваныя, так і незарэгістраваныя. Арганізацыі, якія раней атрымлівалі гранты ад COTTONWOOD FOUNDATION, таксама могуць падаваць заяўкі, але не часцей чым раз на год. Заяўкі пажадана падаваць на англійскай мове. Тэрмін падачы: на працягу 2002 года.

Форма заяўкі змяшчаецца на сайце WWW.COTTONWOODFDN.ORG/GRANTAPP.HTML.

Заяўку неабходна запоўніць на паперы і даслаць, прыклаўшы дакументы, якія арганізацыя лічыць патрэбным даслаць дадаткова.

Адрас: COTTONWOOD FOUNDATION, box 10803, White Bear Lake, NM 55110, USA,

E-mail: cottonwood@igc.org,

Web: WWW.COTTONWOODFDN.ORG,

Phone: (651) 426-8797, Fax: (651) 426-0320.

КОНКУРС

# ХВОСТ ПІСТАЛЕТАМ ТРЫМАЙ, АЛЕ ПРА СНІД НЕ ЗАБЫВАЙ

Клуб “Дзедзіч” сумесна з ГА “Маладзёжны адукацыйны цэнтр “Фіяльта” ў рамках праграмы “Роўны навучае роўнага” абвяшчае конкурс на лепшы **малюнак ці эсэ (замалёўку)** на тэму ВІЧ/СНІД.

**Умовы конкурсу:** Для напісання творчых прац мы прапануем некалькі тэмаў:

– “ВІЧ/СНІД у Рэспубліцы Беларусь”,

– “Здаровыя і хворыя: этыка ўзаемаадносінаў”,

– “Якую пагрозу нясе ВІЧ/СНІД?”.

Гэта могуць быць і іншыя тэмы.

Працы могуць быць як мастацкага, так і публіцыстычнага характару. Максімальны памер – адна старонка А4.

Памер малюнкаў і тэхніка іх выканання не абмежаваныя.

Свае працы дасылайце, калі ласка, на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўлiная, д. 20, кв.2. да 20 траўня 2002 г.

Даведкі можна атрымаць па тэл.: (0162) 22-90-97.

Аўтары лепшых прац будуць узнагароджаныя каштоўнымі прызамі:

– за 1-е месца: фотаапарат;

– за 2-е месца: фотаальбом;

– за 3-е месца: рамка для фотаздымка.




ДАРЭЧЫ

12 прыкмет таго, што хутка выбары:

- Па тэлевізары дзень і ноч рэкламуюць людзей з крылышкамі.

- Журналісты перастаюць «страляць» адзін у аднаго цыгарэты, а паляць свае.

- Вы раптам разумееце, што ўвесь гэты час пра вас хтосьці клапаціўся.

- У прыбіральні нічога немагчыма прачытаць, акрамя кавалкаў нейкіх перадвыбарчых абяцанняў.

- На плоце замест надпісу «Звалка смецця забаронена» з'явіўся надпіс «Разам - да працвітання краіны!».

- Лёс краіны зноў вісіць на валаску. Лёсавызначальнасць нашых часоў узрастае на 15-20%.

- Тэрмінова трэба спыніць хвалю злачыннасці.

- У газетах з'яўляюцца загалоўкі тыпу «Багацце і шчырасць у адной асобе!», «Мы верым табе, Буслаеў!», «Як гандаль баксітамі дазволіць нам аздаравіць экалогію і палепшыць сацыяльны фон».

- Невядомыя людзі на вуліцы просяць у вас аўтограф - хоць вы зусім не Кіркораў! (Ці Кіркораў?!).

- На слупах замест налепак з надпісамі «Ліза», «Лаліта», «Лена» - з'яўляюцца лісткі з надпісамі «Генадзь», «Уладзімір», «Аляксандр».

- Вы п'еце як звычайна - але паспяваеце яшчэ адначасова вырашаць лёсы краіны.

- У вашую паштовую скрынку пачынаюць прыходзіць нейкія газеты - а вы іх не выпісвалі.

***

- У нас у краіне шмат бессэнсоўных рэчаў... Напрыклад, рэклама гарэлкі...

***

Вёска Камароўка. Прафсаюзны сход.

Старшыня калгаса пытае даярку:

- Па якой прычыне хочаш, Марыя, з Іванам разыйсціся?

- ¨н мяне як мужчына не задавальняе!

Жаночы голас з залы:

- Усіх задавальняе, а яе не!

Мужчынскі голас з залі:

- А яе ніхто не задавальняе!

***

Йдуць два сябры і бачаць на другім баку вуліцы двух жанчын:

- Глядзі - мая жонка і палюбоўніца, - кажа адзін.

- Ды не, гэта мая жонка і палюбоўніца, - адказвае другі.

АБ'ЯВЫ

**Рэдакцыя бюлетэня “Дзедзіч” шукае распаўсюджвальнікаў выдання ў навучальных установах [redacted]бласці. [redacted]2-90-97.**

**Рэдакцыя бюлетэня «Дзедзіч» запрашае да супрацоўніцтва карэспандэнтаў з Берасця і [redacted]вобласці. [redacted]еце выказаць [redacted]на нашых [redacted]лефануйце: [redacted]-90-97.**

**ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!**

**У Мерачоўшчыне (Івацэвіцкі р-н), недалёка ад Косаўскага палаца, у 2002 г. будуць праводзіцца работы па аднаўленні сядзібы Тадэвуша Касцюшкі. Будзе арганізаваны летні лагер для валанцёраў, жадаючых прыняць удзел у аднаўленні гістарычнага помніка.**

АБВЯШЧАЕМ НАБОР ВАЛАНЦЁРАЎ у летні лагер у Мерачоўшчыне.

**Калі вас зацікавіла наша прапанова і вы маеце вольны час у жніўні, звяртайцеся да нас. Тэл.: (0162) 22-90-97.**

## АБ'ЯВЫ

### ШКОЛА ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

У верасні 2002 года ў Варшаве будзе працаваць Міжнародная летняя школа правоў чалавека. Магчымасць прыняць удзел у навучанні маюць праваабаронцы, настаўнікі і маладыя юрысты з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, а таксама краін былога СССР. Працоўныя мовы - ангельская, польская, руская. Арганізатары кампенсуюць выдаткі, звязаныя з праездам, пражываннем і харчаваннем. Дадатковая інфармацыя па пададзеных ніжэй кантактах: Mr Adam Pyrek, Programme Coordinator Helsinki Foundation for Human Rights ul.Bracka 18 m 62 00-028 Warsaw POLAND Tel: +48 22 828 10 08 Fax: +48 22 26 98 75 E-mail: pyrek@hfhrpol.waw.pl Web: http://www.hfhrpol.waw.pl.

### КОНКУРС «РАЗАМ СУПРАЦЬ КАТАВАННЯЎ»

Гомельская група Міжнароднай амністыі пры падтрымцы Міжнароднай рады па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў абвяшчае конкурс сачыненняў «Разам супраць катаванняў». Конкурс прысвечаны Міжнароднаму дню ААН у падтрымку ахвяраў катаванняў, які адзначаецца штогод 26 чэрвеня. Тэрмін падачы працаў - да 15 чэрвеня 2002 года. Вынікі будуць падведзеныя 26 чэрвеня 2002 года. Лепшыя сачыненні будуць размешчаныя на сайце Міжнароднай рады па рэабілітацыі ахвяраў катаванняў, а таксама надрукаваныя ў інфармацыйна-прававым бюлетэні «Amnesty International у Беларусі». Пераможцы будуць узнагароджаныя ганаровымі дыпломамі і падарункамі. Працы неабходна адпраўляць на адрас: а/с 10П, 246050, Гомель, Беларусь альбо на e-mail: amnesty@tut.by.

**BARCNEWS**

## КОНКУРС

# КОНКУРС ГРАНТАЎ ДЛЯ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ

МОЛАДЗЕВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЦЭНТР (МІЦ) АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС "ПАДТРЫМКА І РАЗВІЦЦЁ НЕЗАЛЕЖНЫХ МОЛАДЗЕВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ У БЕЛАРУСІ".

**УМОВЫ КОНКУРСУ:**

– заяўкі прымаюцца як ад зарэгістраваных, так і ад незарэгістраваных моладзевых аб`яднанняў,

– праекты прымаюцца толькі ад моладзевых арганізацый, дзейнасць якіх распаўсюджваецца на канкрэтную лакальную мясцовасць (мястэчка, раён, рэгіён і г. д.) альбо навучальную ўстанову.

**Дзеянні кожнай арганізацыі павінны быць накіраваныя:**

– на падтрымку і абарону правоў моладзі;

– на адукацыю лідэраў моладзевых грамадскіх арганізацый (NGO);

– на падтрымку выдавецкай дзейнасці;

– на захаванне нацыянальнай культурнай і гістарычнай спадчыны.

Тэрмін рэалізацыі праектаў – да 30 красавіка 2003 года.

Сума грантаў павінна быць да $1500.

**Інфармацыйная характарыстыка праекта:**

– назва праекта;

– назва арганізацыі альбо нефармальнай групы;

– імя і прозвішча кіраўніка праекта;

– кантактны адрас, тэлефоны, факс, e-mail.

– дата і месца рэгістрацыі або пастаноўкі на ўлік (для зарэгістраваных арганізацый і суполак).

– тэрмін выканання праекта і сума, якая запрошваецца.

**Заяўкі на грант павінны ўключаць наступныя раздзелы:**

– абгрунтаванне неабходнасці фінансавання праекта (background);

– мэты праекта;

– апісанне дзейнасці (activity);

– як вы бачыце працяг праекта (follow up);

– бюджэт з падрабязным апісаннем кожнага артыкула (budget).

Пажадана, каб арганізатары звярнуліся ў МІЦ для кансультацыі перад падачай заяўкі.

**Апошні тэрмін падачы заявак** – 2 чэрвеня 2002 года (уключна).

Вынікі конкурсу будуць вядомыя ў канцы чэрвеня 2002 года.

Пры разглядзе заявак прыярытэт аддаецца:

– арганізацыям з невялікіх гарадоў і мястэчак,

– новастворанымі арганізацыям або арганізацыям, якія не мелі падтрымкі ад спонсараў,

– праектам, якія не з'яўляюцца прыярытэтнымі для большасці іншых фондаў, што працуюць на Беларусі,

– праектам з бюджэтам да $500.

Не фінансуецца: набыццё аргтэхнікі (як правіла) і заробкі арганізатараў і ўдзельнікаў.

Заяўкі дасылаць толькі заказной поштай або прывозіць на адрас:

220013, г. Менск, вул. Дарашэвіча, д. 4, кв. 2.

Кожны заяўнік атрымае ад МІЦ афіцыйнае пацвярджэнне рэгістрацыі заяўкі на працягу тыдня з моманту паступлення заяўкі.

**Кантактны тэлефон:** (017) 2194711. Факс: (017) 2393117. E-mail:yic@bsa.org.by.




Сябрукі!

**Калі самотна?! Дам параду я ахвотна!**
**Кніжку добрую прыдбай – напаткаеш Зямны рай!**
**Трэба ў гэтым дапамога?! Вырушай хутчэй у дарогу,**
**Знайдзі дзядзьку Андруся – мара спраўдзіцца ўся!**

*Для каханай, ці малога, сваякоў, бацькоў ці Бога,*
*Адшукаеш кніжку ты – пасябруем назаўжды!*

Дзядзька Андрусь

**ПРАПАНУЕ** – шмат добрых беларускіх кніжак;
**ДАПАМОЖА** – адшукаць патрэбную кнігу;
**ЗЛАДЗІЦЬ** – на замову паважны кнігазбор;
**А ТАКСАМА** параіць, як пазбавіцца непатрэбных Вам кніг.



*Дзядзьку Андруся проста адшукаць на сядзібе "ВАРУТЫ" па адрэсе: д. 24, вул. Камсамольская, г. Баранавічы, тэл. 8 (0163) 41-70-57; 41-79-51*
**У выпадку маёй адсутнасьці пакіньце Вашыя кантакты.**
*Калі ласка! Заходзьце ды тэлефануйце!*

З павагаю, дзядзька Андрусь



*АБ'ЕКТЫЎНА ПРА РЭАЛЬНАЕ*

**RR**

**РАДЫЁ РАЦЫЯ**

***НА КАРОТКІХ ХВАЛЯХ***
*6035 кГц (49 м) 08:00-10:00*
*6180 кГц (49 м) 13:00-15:00*
*6050 кГц (49 м) 21:00-23:00*
***НА СЯРЭДНІХ ХВАЛЯХ***
*612 кГц (490 м) 07:00-11:00*
**WWW.RACYJA.PL**
*220102, Менск, а/с 144*



Берасцейскае абласное аддзяленне
**Грамадскага аб'яднання ПРАВААБАРОНЧЫ ЦЭНТР «ВЯСНА»**
прапануе грамадзянам бясплатную прававую дапамогу.
(адміністратыўнае і грамадзянскае права, парушэнні правоў чалавека)
**Звяртайцеся на адрас:** г. Берасце, бульвар Шаўчэнкі, д. 7, кв. 24.
Тэл./факс: (0162) 20-13-95.


## ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

**Каб зрабіць наш бюлетэнь больш цікавым і прывабным для цябе і тваіх сяброў, мы звяртаемся да цябе з просьбай адказаць на гэтае пытанне і даслаць адказ на адрас: 224000, г. Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв.2.**

Будзем вельмі ўдзячныя за тваю дапамогу ў стварэнні цікавай сучаснай газеты, а для лянівых паведамляем, што сярод тых, хто дашле нам свае заўвагі, мы разыграем 3 аўдыёкасеты з музыкай беларускіх гуртоў.

Чаго не хапае на старонках "Дзедзіча", якую інфармацыю ты хацеў бы атрымліваць праз яго:
_______________

## УВАГА!

Працягваецца бясплатная падпіска
**на Інфармацыйна-аналітычны бюлетэнь "Дзедзіч".**

Калі ты жадаеш атрымоўваць яго больш стала і аператыўна, запоўні гэты купон і дашлі яго на адрас:
**224000, г.Берасце, вул. Жураўліная, д. 20, кв. 2.**

Чаму ты вырашыў падпісацца: _______________

Прозвішча: _______________

Імя: _______________

Імя па бацьку: _______________

Паштовы адрас: _______________

Тэлефон: _______________

# ВЕСНАВЫЯ ПАЖАРЫ - ПАГРОЗА ПРЫРОДЗЕ БЕЛАРУСІ

22 САКАВІКА НА ПАСЯДЖЭННІ КААРДЫНАЦЫЙНАГА ЭКАЛАГІЧНАГА САВЕТА ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ БЫЛО АБМЕРКАВАНА ПЫТАННЕ ПАЛАЎ (ПАЛЫ - ВЫПАЛЬВАННЕ РАСЛІННАСЦІ). ГРАМАДСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ «ЭКАДОМ» І «АХОВА ПТУШАК БЕЛАРУСІ» ХОЧУЦЬ АБ'ЯДНАЦЬ СВАЕ ВЫСІЛКІ З ДЗЯРЖАЎНЫМІ ОРГАНАМІ, У ПЕРШУЮ ЧАРГУ МІНІСТЭРСТВАМ ПРЫРОДНЫХ РЭСУРСАЎ, У БАРАЦЬБЕ З ПАЛАМІ.



У Беларусі палы забароненыя і караюцца паводле арт. 77 Адміністрацыйнага кодэкса. ¨н прадугледжвае штраф у памеры ад адной да пяці мінімальных заработных плат для грамадзянаў і ад пяці да дваццаці мінімальных заработных плат для адказных асобаў. Палы ўзнікаюць у выніку гаспадарчай дзейнасці, перш за ўсё дачнікаў, карэнных гарадскіх жыхароў. Існуе меркаванне аб тым, што выпальванне расліннасці спрыяе ўрадлівасці. Аднак, як гавораць навукоўцы, эфекту можна дасягнуць толькі калі вытрымаць усе неабходныя ўмовы. Навукоўцы ў адзін голас сцвярджаюць аб шкоднасці палаў. У выніку палаў выгарае гумусавы слой, гінуць жывёлы, знішчаюцца гняздоўі птушак, шкодныя выкіды забруджваюць атмасферу, узнікае пагроза лясных пажараў, другаснага распаўсюджвання радыёнуклідаў.

Грамадскія экалагічныя арганізацыі адны з першых заўважылі небяспеку. У 1998 годзе экалагічная станцыя «Ольса» (Бабруйск) распаўсюджвала ўлёткі сярод насельніцтва аб шкодзе палаў, было падрыхтавана 1000 каляровых плакатаў. Гэтыя ж лістоўкі і плакаты былі памножаны Міністэрствам прыродных рэсурсаў і разасланыя ў раёны краіны для распаўсюджвання сярод насельніцтва. Са свайго боку Міністэрства прыродных рэсурсаў сумесна з органамі ўнутраных справаў, лясной і пажарнай аховы арганізоўвае рэйды-праверкі па прафілактыцы пажараў і недапушчэнні выпальвання сухой расліннасці. За 2001 г. было праведзена 2137 праверак, у выніку якіх накладзена 447 штрафаў на агульную суму 4939 тыс. рублёў. Аднак гэтых мер недастаткова, і таму пытанне паўстае зноў. Прадстаўнікі грамадскіх арганізацый пад час круглага стала прапанавалі цэлы шэраг мер па прадухіленні палаў. Асноўныя - гэта прыцягненне ўвагі грамадскасці і правядзенне экалагічнай адукацыі. Так, напрыклад, грамадская арганізацыя «Экадом» збіраецца праводзіць тлумачальную працу праз пазашкольныя экалагічныя цэнтры, з якімі яна супрацоўнічае. «176 цэнтраў па ўсёй краіне - гэта вялікая моц», - гавораць сябры арганізацыі. Тым больш што ў 40% выпадкаў віноўнікамі палаў з'яўляюцца дзеці (паводле аналізу, праведзенага Міністэрствам прыродных рэсурсаў).



Часта палы становяцца прычынай пажараў, у тым ліку на тэрыторыях заказнікаў. Як паведаміў А.В. Казулін, вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута заалогіі НАН РБ, навуковы дырэктар грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Беларусі», на Палессі мясцовыя палы становяцца прычынай пажараў, якія ахопліваюць вялікія плошчы. Асабліва небяспечныя палы расліннасці ў поймах рэк і на балотах, паколькі там існуюць унікальныя раслінныя і жывёльныя супольнасці, якія ўжо зніклі на большай частцы Заходняй Еўропы. У пойме ракі Ясельда ў заказніку «Спораўскі» грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Беларусі» былі праведзены спецыяльныя даследаванні аб уплывах пажараў на жывёлаў. У выніку выпальвання расліннасці колькасць насякомых на выпаленых участках зменшылася ў 1,8 разоў. На выпаленых балотах і лугах перастаюць гняздзіцца большасць відаў птушак, сярод якіх ёсць некаторыя віды, што знаходзяцца пад глабальнай пагрозай знікнення. Так, у выніку веснавых пажараў колькасць вяртлявай камышоўкі ў Беларусі скарацілася на 30%. Больш за 60% гэтага віду гняздзіцца ў Беларусі, і наша краіна адказвае за захаванне гэтага віду ў свеце. Узнікае пагроза знішчэння рэдкіх відаў жывёлаў і раслінаў, якія ўключаныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Толькі ў 1999 годзе выгарэла каля 500 га балота Ельня (ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння). Яго тэрыторыя падвяргаецца пажарам пастаянна на працягу апошніх 20 гадоў.

**BARCNEWS**

## ДАРЭЧЫ

Ваенрук школы для цяжкіх падлеткаў вельмі любіў гаварыць сваім вучням-таксікаманам:
- Э-эх, хлопцы, вы яшчэ пораху не нюхалі!

***

Педагогаў хвалюе вольны час падлетка і як яго забіць...

***

- Калі вы запрасілі да сябе дзяўчыну пакарміць рыбак, а акварыума ў вас ніколі не было, адчыніце хаця б банку шпротаў. Як правіла, пакрашыўшы туды трошкі хлеба, дзяўчыны пачынаюць здагадвацца, навошта іх запрасілі.

***

Выходзіць негр з піўнушкі. Раптам у яго закружылася галава з перапою, і ён прытуліўся да дрэва ілбом. Побач ідзе рускі мужык:
-Што, дрэнна?
-Угу.
-Дамоў хочаш?
-Угу.
-Давай падсаджу...

***

Ідзе бабуля па горадзе, і пытае ў хлопца:
– Сынок, як мне знайсці плошчу Леніна?
– Бабуль, я думаю, што трэба даўжыню Леніна памножыць на шырыню Леніна.

***

У Беларусі ўсталявалі помнік беларускаму народу - непісаючы хлопчык.
¨н церпіць...

***

Радня праважае сына ў войска.
- Пішы праўду, - кажа маці.
- Там правяраюць, - пярэчыць дзядзька.
- Тады пішы сінім атрамантам (чарнілам), калі добра, а чырвоным, калі дрэнна. І я тады да цябе прыеду.
Сын паехаў. Праз нейкі час прыйшоў ліст: "Усё добра. А дрэнна толькі адно: няма чырвонага атраманту".

№ 3 ДЗЕДЗІЧ
ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ БЮЛЕТЭНЬ
ðàâàíü 2002
ПРЫ ВЫКАРЫСТАННІ МАТЭРЫЯЛАЎ БЮЛЕТЭНЯ СПАСЫЛКІ НА КРЫНІЦУ АБАВЯЗКОВЫЯ
Рэдакцыя можа не падзяляць меркаванні аўтараў і друкаваць артыкулы для далейшай палемікі
СКЛАДАЕМ ПАДЗЯКУ ГА "Брэсцкі абласны цэнтр падтрымкі грамадзянскіх ініцыятыў "ВЕЖА" ЗА ТЭХНІЧНУЮ ДАПАМОГУ
**Заснавальнік** - Ініцыятыўная група моладзі
**Распаўсюджваецца бясплатна** на правах унутранага карыстання
**Падпісана ў друк** 25.04.2002 года ў 18-00
**Наклад** 299 асобнікаў.
**Галоўны рэдактар:** Д.Шыманскі
**Рэдакцыйная калегія:** Я.Берасцейская, Д.Раманоўская, А.Дземідзюк
**Кантактны тэлефон:** (0162) 22-90-97
**E-mail:** dzedzich@mail.ru